№ 22 (620) 10 чэрвеня 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Палітбюро-2009 Уладзімір Сямашка**

Старонка 8



**Дзе адпачыць за 500 даляраў**

Старонка 13

## У НУМАРЫ

**Аўтуховіч і гранатамёт**

Супраць Мікалая Аўтуховіча могуць завесці новую справу. **Старонка 3.**

**Малочная вайна**

Расія забараніла ўвоз 1300 найменняў беларускае малочнае прадукцыі. **Старонка 4.**

**Мясніковіч нарэшце стаў членкарам**

У НАН абіралі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў. **Старонка 9.**

**«Чароўны трусік» Юрыя Дземідовіча**

«Такога з нашай эстрадай не здаралася пасля «Песняроў». **Старонка 7.**

**Добрая кампанія для Вашых дзетак**

Ідзе набор у дзіцячыя садкі з беларускай мовай. **Старонка 15.**

**Хатняя гульня зборнай па мастацтве**

Рэпартаж з беларускага павільёну Венецыянскага Біенале. **Старонка 6.**

**Самы вядомы ананім**

Да 175-годдзя аўтара «Тараса на Парнасе». **Старонка 6.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі старонку 2.

# Першы беларускамоўны міністр

На пасаду міністра культуры прызначаны кар'ерны дыпламат Павел Латушка.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Пра адстаўку былога міністра культуры Уладзіміра Мацвейчука гаварылі вельмі даўно. Былы дырэктар навапалацкага ПТВ №233 хімікаў і дырэктар па ідэалагічнай працы «Белнафтахіму» быў чалавекам выпадковым на гэтай пасадзе. Радзіма сказала стаць дырэктарам Белтэлерадыёкампаніі — Мацвяйчук стаў. Міністрам культуры — будзем старацца! Практыка для Беларусі не новая: танкіста Сівакова таксама ж ставілі кіраваць спортам, ды і колькі такіх прыкладаў. Чыноўнікі мусяць быць узаемазаменныя і гатовыя закрыць сабой амбразуру.

Як бы там ні было, але сваёй працай Мацвяйчук не заслужыў абурэння з боку Лукашэнкі. Можа таму, што працы асабліва ніякай не было. Міністэрства культуры апошнія гады характарызавалі ўсеагульным застоем і бюракратыяй. Мацвейчука ж называлі ці не горшым міністрам культуры. Тым не менш, перавод яго на месца дарадцы прэзідэнта можна разглядаць, як даніну павагі кіраўніка краіны да гэтага чалавека.

Сярод патэнцыйных пераемнікаў Мацвейчука часцей за ўсё называлі прозвішча дэпутата палаты прадстаўнікоў Генадзя Давыдзьку, які сам неаднаразова заяўляў, што не супраць заняць фатэль міністра. Таксама былі размовы пра спевака Анатоля Ярмоленку.

Прызначылі ж Паўла Латушку, які ад кастрычніка 2008 г. знаходзіўся без працы. Прызначэнне 37-гадовага Латушкі кладзецца ў рамкі апошніх кадравых рашэнняў Лукашэнкі давяраць «маладым і энергічным».

Павел Латушка шэсць гадоў працаваў паслом у Польшчы. Прызначаны ён быў у 30-гадовым узросце, такіх маладых амбасадараў у Беларусі яшчэ не было. І працаваць яго паставілі не ў Туркменістан ці Сербію, а ў суседнюю Польшчу. Участак працаёмкі і адказны.

Тое, што Латушка знаходзіўся на пасадзе аж шэсць гадоў, таксама гаворыць пра многае. На час яго працы паслом прыйшлася польска-беларуская дыпламатычная вайна, якая пачалася ў 2005 годзе пасля скандалу з Саюзам палякаў. Праз абвастрэнне стасункаў Латушку некалькі разоў выклікалі для кансультацый у Мінск. Апошні раз — пасля прэзідэнцкіх выбараў 2006 году, калі ўлады былі абураныя «парушэннямі падстаповай Дамовы пра добрасуседства і дружалюбнае супрацоўніцтва» польскім бокам.

Працяг на старонцы 2.



**Маршруты па Беларусі: Слонім і Жыровічы**

Старонка 11.

## Каму паставіць помнікі Міністэрства культуры?

Тут і кароль Міндоўг, і двойчы Герой Савецкага Саюзу генерал-маёр Азі Асланаў.

Міністэрства культуры вырашыла паклапаціцца пра ўвекавечванне памяці выбітных дзеячаў гісторыі. Складзены план устаноўкі помнікаў, скульптур, мемарыяльных знакаў у 2009—2012 гг. Міністэрскі спіс налічвае 70 пазіцый. Прапановы былі атрыманыя ад мясцовых уладаў. Яны будуць і фінансаваць рэалізацыю праекту.

Самыя актыўныя пакуль Полацк (прапановы наконт 4 помнікаў і 1 бюсту), Гомель (5 бюстаў) і Ветка (3 бюсты). Якіх жа асобаў мясцовыя чыноўнікі лічаць вартымі ўшанавання?

**Мінск і Мінская вобласць:**

драматург **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч** (Мінск);

двойчы Герой Савецкага Саюзу генерал-маёр **Азі Асланаў** (Вілейка).

**Брэсцкая вобласць:**

Уладзіміра-валынскі князь **Уладзімір Васількавіч** і княгіня **Вольга** (Кобрын).

**Віцебская вобласць:**

княгіня **Вольга** (Віцебск);

княгіня **Рагнеда** (Полацк);

пісьменнік **Ян Баршчэўскі** (Полацк);

дойлід, будаўнік Спаса-Прэабражэнскай царквы **Іаан** (Полацк).

Працяг на старонцы 9.

# Першы беларускамоўны міністр

Працяг са старонкі 1.

Пасла неаднаразова выклікалі для тлумачэнняў на дыван у польскі МЗС, скажам, калі праз мяжу не пускалі польскіх дэпутатаў, а бывала, што і ў Міністэрства энергетыкі, як гэта было пасля спынення паставак нафты па нафтаправодзе «Дружба». Карацей, служба лёгкай не была. Можа, таму пасол Латушка так заўчасна пасівеў.

Менавіта Павел Латушка ў красавіку 2006 г. прапанаваў план нармалізацыі стасункаў паміж Мінскам і Варшавай, які ў Польшчы быў успрыняты з надзеяй. З усімі гэтымі справамі не забываўся пасол і на культуру. Святы беларускай культуры і мовы пад патранатам амбасады праходзілі як на Беласточчыне, так і ў Варшаве. Сам жа Латушка некалі наваt заняў трэцяе месца на штогадовым адкрытым чэмпіянаце Польшчы па калядных ды навагодніх віншаваннях. Дарэчы, прыз заваяваў чытаннем урыўку з «Новай зямлі» Якуба Коласа ў перакладзе Чэслава Сэнюха.

Тым не менш, амаль паўгоду Латушка заставаўся беспрацоўным. Хадзіла мноства размоваў, куды яго могуць «размеркаваць» — ад намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта да намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкаму.

Павел Латушка адзін з нямногіх чыноўнікаў, які паслядоўна і падкрэслена карыстаецца беларускай мовай. Такім чынам, прызначэнне былога пасла міністрам культуры можна разглядаць і як жэст Лукашэнкі ў бок беларускамоўных і нацыянал-лібералаў. У любым выпадку, сумнявацца не прыходзіцца, што справы ў культуры пойдуць весялей, чым тое было пры Мацвейчуку.

«Наша Ніва» дазванілася да Паўла Латушкі з просьбай аб інтэрв'ю. Навяспечаны міністр папрасіў некалькі тыдняў на тое, каб абжыцца на месцы, але паабяцаў абавязкова пагутарыць.

**Зміцер Панкавец**

**Павел Латушка**

нарадзіўся ў 1973 у Мінску. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (1995), хоць пачынаў вучыцца на гістарычным. Завочна скончыў Лінгвістычны універсітэт (1996). Займаў розныя пасады ў структуры МЗС. У 2000—2002 прэс-сакратар МЗС. Ад 2002 да 2008 быў пaслом Беларусі ў Польшчы. Разведзены, ёсць дачка.

## ARCHE ў Магілёве, Полацку, Віцебску

**11 чэрвеня ў Магілёве (Цэнтр «Кола», зав.Чкалава 16)** адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўручэння прэміі часопісу ARCHE «За сумленнае слова» за 2009 год гісторыку Рашэду Чаўдхуры, які каранямі з гораду над Дняпром.

Удзел возьме рэдактар часопісу Валер Булгакаў. Лаўрэат жа выступіць з прамовай. **Пачатак а 18.30.** Цырымонія адбудзецца пры падтрымцы грамадскай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі».

**18 чэрвеня ў Полацку** пройдзе прэзентацыя Полацкага нумару ARCHE з удзелам Уладзіміра Арлова, Лявона Баршчэўскага і Валера Булгакава. **Пачатак а 19.00.** Даведкі па т.: (029)550–79–69.

**20 чэрвеня** чакаецца прэзентацыя ARCHE **ў Віцебску**. Даведкі па т.: (029)550–79–69.




## Збяры Кнігарню «Наша Ніва»

**Віктар Казько «Бунт незапатрабаванага праху»**

пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

## СЦІСЛА

### Крэдыт усё ж дадуць?

Крэдыт Беларусі ў памеры 500 млн даляраў можа быць выдзелены са сродкаў антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, заявіў віцэ-прэм'ер Расіі Аляксей Кудрын. Паводле слоў Кудрына, антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС будзе створаны на працягу бліжэйшых двух месяцаў. 9 чэрвеня на пасяджэнні Міждзяржсавету ЕўрАзЭС у Маскве плануецца падпісаць дагавор аб заснаванні антыкрызіснага фонду, а таксама пагадненне аб кіраванні сродкамі фонду з Еўразійскім банкам развіцця. Доля Расіі ў фондзе складзе $7,5 млрд з $10 млрд.

У склад ЕўрАзЭС уваходзяць Беларусь, Казахстан, Кіргізія, Расія і Таджыкістан. Статус назіральніка пры арганізацыі маюць Малдова і Украіна.

### Зельцэр аб'явіў галадоўку

Амерыканскі грамадзянін Эмануіл Зельцэр, які адбывае трохгадовы тэрмін зняволення ў калоніі № 15 у Магілёве, 8 чэрвеня аб'явіў галадоўку. Ён спрабуе прыцягнуць увагу да факту зацягвання рашэння аб прымяненні да асуджанага амністыі.

### Шыла атрымае атэстат

Лідэр салігорскай моладзі Іван Шыла здаў на 9 балаў экзамен па англійскай мове. Гэта дазволіць хлопцу атрымаць школьны атэстат. Летась яго выключылі са школы за дзень да апошняга экзамену, а праз паўгоду прызвалі ў войска. Дабро на тое, каб Івану дазволілі здаць іспыт, даў асабіста міністр Мальцаў.

### Бяляцкі, Стэфановіч і Лабковіч кінулі выклік уладам

Праваабаронцы абвясцілі, што будуць адкрыта дзейнічаць ад імя незарэгістраванага праваабарончага цэнтру «Вясна». 25 мая Міністэрства юстыцыі ў трэці раз вынесла рашэнне пра тое, што праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Наша Вясна» не можа быць зарэгістраванае.

**БелаПАН**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| | | | |
|---|---|---|---|
| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | Дата | Сума |
|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | |
| Агулам | | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| | | | |
|---|---|---|---|
| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | Дата | Сума |
|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | |
| Агулам | | |

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Л.В., Сяргею З., А.С., Т.П., М.Д., Г.З., Аляксею К., А.К., Сяргею К., Н.Б.. Л.Л., В.Ц., Міхаілу Т., Ліліі Б., Веры С., Генадзю Л.** з Мінску.

**Чэславу В., Г.Б., Святлане К.** з Ліды.

**Л.К., Д.П.** з Мінскага раёну.

**А.Л., А.Н., Леаніду Д., Канстанціну С., К., Яўгенію К.** з Віцебску.

**Л.А., Тадэвушу Ш.** з Маладзечанскага раёну.

**Алякандру М.** з Астравецкага раёну.

**Юрасю Н., А.К., Інэсе В.** з Аршанскага раёну.

**В.Л.** з Смаргонскага раёну.

# Аўтуховіч і гранатамёт

**У панядзелак міністр замежных справаў Славеніі Барыс Жбогар выказаў спадзяванне, што бліжэйшым часам «новыя палітвязні будуць вызваленыя».**



Ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч **(на фота)** сядзіць ужо чатыры месяцы. Тым не менш, нядаўна следства па яго справе было падоўжанае яшчэ на месяц, да 3 ліпеня. Праваабаронца Алег Воўчак кажа, што нядаўна вырашалася пытанне аб завядзенні супраць ваўкавысца новай крымінальнай справы: «Гранатамёт, знойдзены недзе ў горадзе, хочуць павесіць на Мікалая. Доўга думалі, ці заводзіць гэтую справу, аднак пакуль усё пакінулі, як і было».

Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку вінавацяць у падпалах і падрывах дамоў мясцовых чыноўнікаў Кацубы і Мандзіка. Апошнія не маюць прэтэнзій да арыштаваных — па справах ужо былі знойдзеныя вінаватыя.

«Падчас нядаўняга візіту пасла АБСЕ Шмідта да Аўтуховіча следчыя скардзіліся, што зняволены не хоча з імі супрацоўнічаць. Наколькі я разумею, гэтак яны кажуць пра тое, што Мікалай не хоча «браць на сябе» гранатамёт. Ідзе пастаянны ціск на Лявонава і Асіпенку», — расказвае Алег Воўчак.

**Воўчак: калі б у следства былі доказы, іх не сталі б замоўчваць**

Праваабаронца перакананы, калі б у следства былі доказы, яны б не сталі іх замоўчваць. «Не праводзіцца ніякіх следчых дзеянняў. Ні допытаў, ні вочных ставак. Вельмі падобна, што справа шытая белыя ніткамі. Але калі ёсць арыштаваныя, іх трэба ў нечым абвінаваціць, вось і знайшлі цяпер «гранатамёт», — гаворыць А.Воўчак.

Тым часам Мікалай Аўтуховіч не збіраецца спыняць галадоўку пратэсту, якая цягнецца ўжо 50 дзён. Ён дамагаецца разгляду справы ў судзе ці змянення меры стрымання. «Мае намер галадаць да апошняга, — кажа адвакат вязня Павел Сапелка. — Вельмі знясілены. Ёсць праблемы з пячонкай».

«Я баюся за яго. Невядома, у які дзень могуць пачацца незваротныя працэсы ў арганізме, гэта ўжо вельмі небяспечная мяжа. Сем'і вельмі перажываюць, жонкі часта плачуць. Я прасіў Мікалая спыніць галадоўку, на волю яго трэба выцягнуць здаровага», — кажа А.Воўчак.

На ягоную думку, цяпер галоўную ролю ў вызваленні Аўтуховіча павінны сыграць замежныя дыпламаты і еўрапейскія палітыкі. У панядзелак, наведваючы Мінск, міністр замежных справаў Славеніі Барыс Жбогар выказаў спадзяванне, што бліжэйшым часам «новыя палітвязні будуць вызваленыя».

**ЗП**

### Напішы палітвязням

**Мікалай Аўтуховіч**
вул. Валадарскага, 2,
СІЗА №1, камера 14, 220050, Мінск
**Юры Лявонаў**
вул. Валадарскага, 2,
СІЗА №1, камера 54, 220050, Мінск
**Уладзімір Асіпенка**
вул. Валадарскага, 2,
СІЗА №1, камера 22, 220050, Мінск

# Яшчэ адзін юрыст у Адміністрацыі прэзідэнта

Новым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта прызначаны праўнік Валеры Міцкевіч. «Мы павінны ствараць такое заканадаўства, якое павінна быць простым, зразумелым і служыць эканоміцы», — сказаў В.Міцкевіч пасля прызначэння.

Валерыю Вацлававічу Міцкевічу 45 гадоў, ён нарадзіўся ў Лідзе (Гродзеншчына). Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (1989). Спецыяльнасць — правазнаўства. Дванаццаць гадоў працаваў у судзе Мінскага раёну і Заслаўя, дзе даслужыўся да старшыні суду. Быў намеснікам міністра юстыцыі. З сакавіка 2005 году — дырэктар Цэнтру заканадаўства і прававых даследаванняў. Уваходзіць у склад Цэнтравыбаркаму ў ліку чальцоў, прызначаных кіраўніком дзяржавы.



Апроч Міцкевіча, юрыдычную адукацыю ў Адміністрацыі прэзідэнта мае першая намесніца Уладзіміра Макея спадарыня Пяткевіч. Тым не менш, апошнім часам гавораць, што хутка Наталля Уладзіміраўна мусіць сысці ў адпачынак.

Пад кіраўніцтвам Валерыя Міцкевіча праходзілі перамовы беларускага боку з БДІПЧ АБСЕ па карэкціроўцы выбарчага заканадаўства. Дарэчы, ён аднагрупнік старшыні БХК Алега Гулака.

Іншы сябра Хельсінскага камітэту, Гары Паганяйла, кажа пра Міцкевіча: «Гэта юрыст высокага класа, прафесіянал добры і, па-мойму, прытрымліваецца цалкам дэмакратычных поглядаў. У мяне такое ўражанне, што з Міцкевічам можна мець справу».

Нагадаем, што, апроч Міцкевіча, намеснікамі Уладзіміра Макея з'яўляюцца Наталля Пяткевіч, Леанід Анфімаў і Мікалай Снапкоў.

Месца віцэ-прэм'ера, якое вызвалілася пасля прызначэння Аляксандра Косінца старшынёй Віцебскага аблвыканкаму, заняў міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык. Ён доўгі час працаваў у Гомельскім аблвыканкаме, але потым атрымаў рэзкае павышэнне — стаў памочнікам Лукашэнкі, інспектарам па Мінску. Потым ён змяніў на міністэрскай пасадзе Антаніну Мараву.

Былы міністр замежных справаў і пасол Беларусі ў ЗША Міхаіл Хвастоў атрымаў прызначэнне пастаяннага прадстаўніка нашай краіны пры ААН у Жэневе. А вось новага пасла ў ЗША Лукашэнка прызначаць не стаў.

**Зміцер Панкавец**



УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

# Ліберман угаворвае Беларусь не сябраваць з Іранам

**За гэта Ізраіль абяцае 500 мільёнаў даляраў інвестыцый.**

Мінск наведаў міністр замежных справаў Ізраілю Авігдор Ліберман. Гэта быў першы візіт ізраільскага прадстаўніка такога ўзроўню за апошнія 15 гадоў.

Ліберман меў перамовы з Аляксандрам Лукашэнкам, а таксама са сваім калегам Сяргеем Мартынавым. «Ізраіль — краіна для нас не чужая, там пражывае не адзін дзесятак тысяч, не адна сотня тысяч нашых суайчыннікаў», — адзначыў Лукашэнка. Таксама кіраўнік дзяржавы выказаў спадзяванне, што аўтарытэт Лібермана паспрыяе нармалізацыі адносінаў Беларусі «не толькі з Еўропай, але і з Амерыкай».

Ужо на сённяшні дзень Ізраіль збіраецца інвеставаць у беларускую эканоміку, у праект «Сіліконавая даліна», 500 млн даляраў. І, паводле словаў Лібермана, гэта можа быць толькі першая інвестыцыя. Значная частка яго выступу была прысвечаная пытанню беларуска-іранскіх стасункаў. «Іран — пагроза нестабільнасці на Блізкім Усходзе. Усе баевікі праходзяць там падрыхтоўку ці карыстаюцца іранскімі грашыма. Спадзяюся, мы знойдзем разуменне па гэтым пытанні», — сказаў Ліберман, які зрабіў сабе палітычную кар'еру на антыіранскай рыторыцы.

Потым прэс-сакратар МЗС Вадзім Папоў быў вымушаны даводзіць, што супрацоўніцтва між Іранам і Беларуссю не скіраванае супраць трэціх краін.

Варта адзначыць, што Авігдора Лібермана падчас прыезду ў Мінск суправаджаў былы пасол Ізраілю ў Беларусі Зееў Бен-Ар'е. Па нашых звестках, сп.Бен-Ар'е цяпер з'яўляецца дарадцам міністра па пытаннях краін СНД.

**ЗП**

# Правал левых

**Пройгрышам левых партый ва ўсіх краінах ЕС скончыліся выбары ў Еўрапарламент, якія праходзілі з 4 па 7 чэрвеня.**

Выбарцы краін Еўрасаюзу выразшалі лёс 736 мандатаў. Паводле папярэдніх вынікаў, найбуйнейшае еўрапейскае наднацыянальнае палітычнае аб'яднанне — Еўрапейская народная партыя — захавае кантроль у Еўрапарламенце. У іх будзе ад 267 да 271 месца.

Другой па ліку палітычнай сілай застануцца сацыялісты (157 — 161 мандат). Хоць менавіта яны найбольш страцілі на выбарах. Альянс лібералаў і дэмакратаў Еўропы можа разлічваць на 80—82 мандаты, зялёныя — на 51. Далей ідуць Саюз за Еўропу нацый — згуртаванне еўраскептычных палітычных сілаў (брытанскія кансерватары, польская партыя «Закон і справядлівасць», чэшскі Грамадзянскі форум) з 35 мандатамі, аб'яднаныя левыя (камуністы, левакі і трацкісты) з 33, група незалежных дэпутатаў з 20-цю.

Упэўненыя перамогі правыя атрымалі ў Германіі, Італіі, Польшчы, Францыі. Вельмі кепскі вынік паказалі левыя ў Вялікабрытаніі, Партугаліі і Іспаніі.

Брытанскія лейбарысты занялі толькі трэцяе месца, саступіўшы кансерватарам, якія цяпер знаходзяцца ў апазіцыі. Яшчэ лейбарысты абсалютна нечакана саступілі Партыі незалежнасці Аб'яднанага Каралеўства.

Цікава, што крайне правыя партыі паказалі добры вынік у Галандыі і Аўстрыі. Антымусульманская партыя «Герта» ўзяла другое месца ў краіне цюльпанаў. Аўстрыйская партыя свабоды падвоіла колькасць сваіх дэпутатаў. Два дэпутацкія мандаты заваявала і Брытанская нацыянальная партыя.

На выбарах у Літве перамаглі хрысціянскія дэмакраты. «Саюз Айчыны» набраў 26,4% галасоў, на другім месцы аказалася Сацыял-дэмакратычная партыя — 18,62%.

У Польшчы ўпэўнена перамагла «Грамадзянская платформа» прэм'ер-міністра Дональда Туска, яе вынік 44% галасоў. У Германіі — ХДС/ХСС (37,9%).

У Швецыі з 18 дэпутацкіх мандатаў адзін атрымаў прадстаўнік ад Партыі піратаў. Дарэчы, гэтая партыя, што выступае за аблягчэнне заканадаўства ў сферы інтэлектуальнай уласнасці, трэцяя па колькасці ў краіне.

Агулам яўка на выбарах склала 43,24% — самы нізкі паказчык за ўсю гісторыю выбараў у Еўрапарламент. Найбольшая яўка была ў Італіі (67%), найменшая — у Славакіі (19,6%).

Правал левых можна патлумачыць тым, што ў значнай частцы краін Еўрасаюзу менавіта левыя партыі знаходзіліся ва ўладзе. І ў эканамічным крызісе людзі былі схільныя вінаваціць менавіта іх.

**АГ, ЗП**

# «Брацкія» войны

**Расія забараніла ўвоз 1300 найменняў беларускае малочнае прадукцыі. Сітуацыю ўжо паспелі назваць «малочнай вайной». Гэта дае нагоду ўзгадаць, якія яшчэ гандлёвыя «войны» здараліся між краінамі—суседкамі ў апошнія гады і чым яны скончыліся.**



**Што?** Малочная прадукцыя.
**Калі?** Чэрвень 2009.
**Афіцыйнае абгрунтаванне.** Беларускія вытворцы не пераафармілі дакументацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічнага рэгламенту Расіі.
**Неафіцыйнае тлумачэнне.** Датацыі беларускай прамысловасці ставяць яе прадукцыю ў больш выгаднае становішча з расійскімі аналагамі.
**Чым скончылася.** Прадпрыемствы атрымалі дазвол на імпарт прадукцыі ў Расію, Беларусь адмовілася ад незаконных паставак мяса.

**Што?** Газ.
**Як?** Спрэчкі вакол цаны газу для Беларусі на наступны год.
**Калі?** У канцы кожнага году.
**Афіцыйнае абгрунтаванне.** Расія думае, ці прадаваць Беларусі газ па льготных цэнах.
**Неафіцыйнае тлумачэнне.** Цікава, колькі каштуе згаворлівасць Беларусі ў палітычных пытаннях?
**Чым канчаецца.** Бакі згаджаюцца на кампрамісны варыянт.

**Што?** Мяса.
**Як?** Беларускаму мясу закрыты ўезд у Расію.
**Калі?** Май 2007.
**Афіцыйнае абгрунтаванне.** Сістэматычныя парушэнні ветэрынарнага заканадаўства Расіі пры ўвозе мясной прадукцыі беларускімі прадпрыемствамі.
**Неафіцыйнае тлумачэнне.** Перапродаж у Расію таннага польскага мяса.

**Што?** Нафтавыя мыты.
**Як?** Беларусь заявіла, што пры транспарціроўцы нафты праз краіну Расія павінна плаціць 45 даляраў за тону.
**Калі?** Студзень 2007.
**Афіцыйнае абгрунтаванне.** У мэтах забеспячэння эканамічных інтарэсаў Беларусі з прычыны пагаршэння стану нафтаперапрацоўчай галіны.
**Неафіцыйнае тлумачэнне.** Наш адказ Чэмберлену: вы нам даражэйшы газ — мы вам мыты.
**Чым скончылася.** Кампрамісны варыянт: газ падаражаў не так моцна, мыт уведзены, але таксама меншы.

**Што?** Цукар.
**Як?** Забарона на ўвоз беларускага цукру ў Расію.
**Калі?** Студзень 2007.
**Афіцыйнае і неафіцыйнае абгрунтаванне.** Беларускія вытворцы пад відам свайго цукру пастаўляюць у Расію прадукцыю з іншых краін, не аплачваючы мыты.
**Чым скончылася.** Беларусь абмежавала памеры паставак цукру ў Расію.

**Што?** Цукеркі.
**Як?** Праз беларуска-расійскую мяжу не прапускаліся фуры з цукеркамі.
**Калі?** Жнівень 2006.
**Афіцыйнае абгрунтаванне.** Канфлікт дзеля савецкіх кандытарскіх брэндаў, якія выпускаюцца і ў Беларусі, і ў Расіі.
**Неафіцыйнае тлумачэнне.** Адказ Беларусі на прапановы Расіі ўвесці мыты на імпарт беларускага цукру.
**Чым скончылася.** Вырашэнне праблемы брэндаў — і цукеркі пераходзяць мяжу.

**Што?** Беларуская тэхніка.
**Як?** Расійскі «Саюзаграмаш» зразумеў, што знаходзіцца ў няроўных умовах з беларускім «Гамсельмашам».
**Калі?** Ліпень 2006.
**Афіцыйнае і неафіцыйнае абгрунтаванне.** Доступ расійскай сельскагаспадарчай тэхнікі на беларускі рынак закрыты, а беларуская тэхніка пастаўляецца на ўсход па завышаных цэнах.
**Чым скончылася.** Часовае замірэнне на ранейшых умовах.

**Што?** Піва.
**Як?** Увядзенне квотаў на імпарт расійскага піва.
**Калі?** 2003.
**Афіцыйнае абгрунтаванне.** Прыцягненне на рынак Беларусі ў першую чаргу буйных піваварных кампаній, якія станоўча сябе зарэкамендавалі.
**Неафіцыйнае тлумачэнне.** Беларусь абмяжоўвае прысутнасць на сваім рынку расійскіх кампаній, каб даць развіцца айчынным піваварням.
**Чым скончылася.** Адмена абмежаванняў у 2007 годзе.

**Ягор Марціновіч**

**Беларусь рыхтуе прарыў на малочны рынак ЕС**

Шэраг малочных прадпрыемстваў наведалі інспектары Еўракамісіі, па выніках іх праверкі будуць вызначаныя экспарцёры малочнай прадукцыі на Захад. Беларусь звярнулася да Міністэрстваў сельскай гаспадаркі Польшчы і Літвы з просьбай падтрымаць нашу краіну пры прыняцці гэтага рашэння. Выхад на еўрапейскі рынак ставіць перад беларускімі вытворцамі задачу павышэння якасці прадукцыі і тэхналагічнага пераўзбраення.

Варта адзначыць, што зрухі ў еўрапейскім накірунку адбываюцца на тле росту стратнасці экспарту малочнай прадукцыі. Па словах памочніка міністра сельскай гаспадаркі і харчу Казіміра Раманоўскага, стратнасць паставак малака і масла на сёння складае 30%, сыроў — 20%. Аднак Беларусь працягвае нарошчваць аб'ёмы вытворчасці малака. Чыноўнікі міністэрства спадзяюцца, што крызіс мінецца і цэны на малочную прадукцыю ізноў папаўзуць угару. А пакуль дзяржава будзе падтрымліваць вытворцаў з тым, каб захаваць экспартную нішу.

**БелаПАН**

# Адмоўны баланс на рахунку дзяржавы

**За першыя чатыры месяцы году імпарт перавысіў экспарт на 1,9 млрд даляраў, што стварае наймацнейшы ціск на рубель.**

Плацежны баланс краіны — суадносіны паміж грашыма, якія краіна выплачвае за мяжу, і грашыма, якія з-за мяжы прыплываюць у Беларусь. Калі імпарт большы за экспарт, а іншых крыніцаў паступленняў з-за мяжы няма, краіна адчувае дэфіцыт грошай. Тое, з чым змагаецца беларускі ўрад, але ніяк не можа перамагчы.

Адмоўнае сальда было ў Беларусі даўно. Іншая рэч, наколькі хутка яно расце. Пачынаючы з 2005 году, дэфіцыт бягучага рахунку рос. Мінулы год аказаўся для эканомікі самым правальным.

| | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 |
|---|---|---|---|---|
| Сальда замежнага гандлю таварамі (млрд даляраў) | -0,6 | -2,3 | -4,0 | -5,1 |

Урад увесь час гаворыць пра памяншэнне аб'ёмаў імпарту. Напрыклад, дзеля гэтага былі ўзнятыя мытныя пошліны на тавары, аналагі якіх робяцца ў айчыннай вытворчасці. Але экспарт падае з такой жа хуткасцю! На прадукцыю беларускіх прадпрыемстваў аказваецца ўсё складаней адшукаць пакупнікоў за мяжой.

| | Студзень-сакавік 2008 | Красавік-чэрвень 2008 | Ліпень-верасень 2008 | Кастрычнік-снежань 2008 | увесь 2008 | Студзень-сакавік 2009 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сальда | -0,65 | -1,41 | -1,8 | -2,25 | **-6,1** | -1,87 |
| Экспарт | 8,05 | 9,28 | 9,37 | 6,35 | **33,05** | 4,1 |
| Імпарт | 8,7 | 10,69 | 11,17 | 8,6 | **39,16** | 5, 97 |

## 2009

У гэтым годзе сітуацыя з экспартам складваецца досыць стабільна. Ён стабільна нізкі. Адмоўнае сальда ў гандлі таварамі і паслугамі за студзень-красавік ужо склала 1,9 мільярда даляраў. І гэты прытым, што ў (як заўсёды аптымістычным) прагнозе ураду




меркавалася, што па выніках усяго 2009 году яно дасягне максімум 1,5 мільярда даляраў.

Асабліва вялікі мінус маем у гандлі таварамі.

| | Студзень | Люты | Сакавік | Красавік | Студзень-красавік 2009 |
|---|---|---|---|---|---|
| САЛЬДА | -0,46 | -0,68 | -0,72 | -0,75 | -2,6 |
| ЭКСПАРТ | 1,3 | 1,3 | 1,5 | 1,5 | 5,6 |
| ІМПАРТ | 1,76 | 1,98 | 2,22 | 2,25 | 8,2 |

Агулам экспарт тавараў, у параўнанні з леташнім, зменшыўся на 48,4%.

## Сітуацыя хелп, сітуацыя SOS

Звычайна сальда кампенсуецца за кошт уласных валютных рэзерваў альбо з дапамогай замежных крэдытаў і інвестыцый.

Беларусь, як можа, накачваецца крэдытнымі ўліваннямі і спадзяецца атрымліваць чарговыя замежныя пазыкі. Пры гэтым атрыманай валютай кампенсуецца адмоўнае сальда і ўтрымліваецца курс рубля. Аднак гэта толькі адцягвае вырашэнне праблемы, прычына не ліквідуецца.

**Ягор Марціновіч**

## СЦІСЛА

### Золатавалютныя рэзервы Беларусі ў маі зноў скараціліся на 10%

Золатавалютныя рэзервы Беларусі, разлічаныя згодна стандартаў МВФ, знізіліся ў маі 2009 г. на $327,5 млн (9,2%) і па стане на 1 чэрвеня склалі $3237,3 млн супраць $3564,8 млн па стане на 1 мая, паведаміў Белстат.

### Няпоўны тыдзень

Колькасць работнікаў, што працуюць няпоўны час, у красавіку склала 75,6 тыс. чалавек, што ў 1,2 разу больш, чым у сакавіку 2009 году, і ў 8,3 разу больш, чым у красавіку 2008 году.

### Кудрын: другая хваля крызісу непазбежная

Віцэ-прем'ер Расіі Аляксей Кудрын назваў другую хвалю эканамічнага крызісу непазбежнай. «Але мы дамо ёй рады шляхам рэкапіталізацыі банкаў», — заявіў Кудрын у часе Пецярбургскага эканамічнага форуму.

**МБ**

# Лукашэнка: Мы павінны пралічыць наступствы далучэння Беларусі да Расіі

**А.Лукашэнка ў інтэрв'ю расійскім СМІ доўга тлумачыў, чаму ён супраць уваходжання Беларусі ў склад Расіі. З ягоных словаў выходзіла так, нібы ён не супраць уваходжання ў склад Расіі ў прынцыпе, але гэтага не дапусцяць «самыя актыўныя, самыя амбітныя, самыя–самыя адмарожаныя».**

«У нас жа ў Беларусі не дурны народ, ён мысліць гэтаксама, як і расійцы: «свая зямля, нікому не аддамо, кашулю рванулі і пайшлі». Расійцы — адзін да аднаго. Вы што, хочаце яшчэ адну Чачню тут? Я не хачу».

«Мы як кіраўнікі павінны пралічыць наступствы гэтага. Вось нават я, дапусцім, прымаю такое рашэнне, а што заўтра? Мала канфліктаў на Каўказе? Цяпер Расію бамбяць за тое, што яна па-імперску, са зброяй у руках прыдушыла, падпарадкавала... А тут што? З гэтага пункту гледжання прэзідэнт Расіі кажа: «Так, ты ва ўсім маеш рацыю... Гэта абсалютна шкодна для Расіі», — заявіў А.Лукашэнка.

«З іншага боку, тут жа нашыя адмарозкі, іх няшмат, няхай два, няхай тры працэнты, але гэта самыя актыўныя, самыя амбітныя, самыя-самыя адмарожаныя ў любым градстве. Яны гатовыя развязнуць нацыянальна-вызваленчую вайну. Ім патрэбная падстава. Цяпер усе кпяць з гэтага. І вы што, думаеце, у іх няма чым ваяваць? Ім заўтра ж прывязуць з Украіны, з Прыбалтыкі, у нас у асноўным адтуль, з Польшчы каналы ў іх», — заявіў ён.

«Імгненна з'явіцца зброя, выбухі, дэстабілізуюць абстаноўку, і многія ў грамадстве падумаюць: слухайце, гэта ж змагаюцца за незалежнасць, за святое», — сказаў ён.

### Дэталі колішняй размовы з Саланам

«Калі паўстала пытанне, тут быў і Салана [найвышэйшы прадстаўнік Еўрапейскага саюзу па пытаннях замежнай палітыкі і палітыкі бяспекі, генеральны сакратар Рады Еўрасаюзу Хаўер Салана. — заўв. рэд.], мы з ім размаўлялі... І калі мне было пастаўлена пытанне па Расіі і іншае, мы спрачаліся, спрачаліся, а далей я яму кажу: «Вы нам Расію заменіце?» — «Не, не, не». — «Дык чаго перад намі пытанне ставіце?!» Я ўжо прагматычнае пытанне задаў... «Не замяніце. Больш за тое, — кажу, — улічыце, мы — адзін народ. Мы думаем як расійцы, як расіяне. Мы жывем, як яны. У нас адныя каштоўнасці...» Ён зразумеў гэта».

### Кудрыну лячыцца трэба

На адрас расійскага віцэ-прэм'ера і міністра фінансаў Аляксея Кудрына: «Мне патлумачылі, што на яго ідзе моцны ціск. Ён моцна нервуецца і гаворыць крыху не тое. Тады — падлячыцца. У яго фінансы дзяржавы ў руках, і ён пачынае такое казаць. Заўтра ён і не тое зробіць».

### Пагадненне пра СПА падпісанае пад ціскам Масквы

Лукашэнка прызнаўся, што прасіў адкласці падпісанне дамовы, але вымушаны быў паддацца.

«Так, падпісалі мы гэтую дамову, што Расія «гвалтам крычала»... Нас папярэдзілі амерыканцы і еўрапейцы: СПА — пытанне нумар адзін нашых адносінаў з Беларуссю».

«Я тады, адкрыю сакрэт, кажу кіраўнікам Расіі: слухайце, навошта баламуціць? Бо ж фактычна супрацьпаветраная абарона сёння працуе ў інтарэсах Расіі. Уся інфармацыя ў рэжыме рэальнага часу паступае ў расійскую сталіцу. Навошта тут яшчэ нейкая Дамова і астатняе? Каб піяр нейкі ў СМІ развярнуць? Давайце пачакаем, пакуль мы тут», — заявіў Лукашэнка. У адказ на гэта расійскі бок заявіў: «Не, не!»

«Але я паабяцаў, я ў свой час паабяцаў і кажу: «Няхай, раз гэта так трэба, падпішам. Падпісалі. Праўда, еўрапейцы і амерыканцы неяк перажылі гэта», — выказаўся ён.

«Нават пасля гэтага МВФ выдзеліў на 2 мільярды даляраў крэдыту. Што, вы думаеце, без амерыканцаў? Ды амерыканцы там. Яны «ўстрымаліся» падчас галасавання». Не галасавалі «за». Але далі адмашку і кажуць: «Выдзеліць трэба Беларусі крэдыт. Цяжкае становішча. Трэба выдзеліць», — заявіў А.Лукашэнка.

**З інтэрв'ю А.Лукашэнкі расійскім СМІ**

# Шантажысты XXI стагоддзя

Піша **Віталь Тарас**.

Падземны ядзерны выбух і запуск балістычных ракет у КНДР, выхад яе з дамовы аб перамір'і з Паўднёвай Карэяй — усё гэта чарговы раз прыцягнула ўвагу ўсяго свету да палітыкі Пхеньяну і асобы паўночнакарэйскага дыктатара Кім Чэн Іра.

Дарэчы, сёлета споўніцца 15 гадоў ад моманту прыходу яго да ўлады. Акурат столькі ж кіруе Беларуссю і Аляксандр Лукашэнка.

Ён перамог на прэзідэнцкіх выбарах у другім туры — 10 ліпеня. А 12 ліпеня на закрытым пленуме ЦК Працоўнай партыі Карэі было прынятае рашэнне аб перадачы ўсёй улады ў краіне пасля смерці «вялікага правадыра» Кім Ір Сэна ягонаму сыну Кім Чэн Іру. Зразумела, ёсць розніца паміж дэмакратычнымі выбарамі і прызначэннем на пасаду тайным сінклітам. Ёсць таксама вялікая розніца паміж лозунгамі Чучхе (паўночнакарэйская версія марксізму) і лозунгамі «рынкавага сацыялізму», а тым больш «лібералізацыі», абвешчанымі ў Беларусі.

Узровень эканамічнага развіцця, як і ўзровень жыцця ў Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы, нельга нават параўнаць з узроўнем жыцця сярэднестатыстычнага беларуса. У Беларусі, адрозна ад Паўночнай Карэі, даўно няма пагрозы масавага голаду. Затое ў КНДР ёсць радовішчы ўрану...

Кіраўнікі абедзвюх краінаў зусім не падобныя паміж сабой. Па-першае, Кім Чэн Ір на 13 гадоў старэйшы за Лукашэнку. Паводле савецкіх і кітайскіх дакументаў, нарадзіўся ён у вёсцы Вяцкае ў Хабараўскім краі, дзе прайшло і яго дзяцінства. У Пхеньяне ў сям'і вышэйшага кіраўніка краіны Кім-малодшы ніколі не адчуваў ні ў чым нястачы. Пры гэтым ён ніколі не гуляў у хакей і не займаўся іншымі відамі спорту. Неспартовы лад жыцця і ахвочасць да салодкае кепска адбіліся на здароўі «вялікага кіраўніка». На апошніх здымках ён выглядае яўна старэйшым за свае гады. (Хадзілі чуткі, што карэйскі дыктатар перанёс гіпертанічны крыз.) Тым не менш, дыктатар быў тройчы жанаты і мае, як мяркуецца, трох сыноў. Паводле іншых звестак — у яго13 пазашлюбных дзяцей. Так што ёсць да чаго імкнуцца іншым кіраўнікам.

І ўсё ж, калі гаварыць сур'ёзна, ёсць і нешта сапраўды супольнае паміж рэжымамі ў Мінску і Пхеньяне. Кім Чэн Ір ва ўсім свеце лічыцца ізгоем. Але ж і Аляксандра Лукашэнку да апошняга часу называлі «апошнім дыктатарам Еўропы», краіна заставалася ў міжнароднай ізаляцыі, супраць яе дзейнічалі дыпламатычныя і нават эканамічныя санкцыі. А ў сусветных рэйтынгах свабоды слова і ўсіх іншых свабодаў РБ у апошнія гады займае месцы не нашмат вышэйшыя за КНДР, якая нязменна замыкае спіс краінаў.

Падабенствы ў замежнай (а часткова і ўнутранай) палітыцы кіраўнікоў Паўночнай Карэі і Беларусі ад самага прыходу іх да ўлады палягала на процістаянні «цывілізаванаму свету» — то бок, Захаду.

У выступах Аляксандра Лукашэнкі заўсёды прысутнічала дый цяпер захавалася ваенная рыторыка, дух канфрантацыі з ЗША і НАТО. Неаднойчы ён выказваў шкадаванне ў сувязі з вывадам ядзернай зброі з тэрыторыі Беларусі.

Што было б, калі б яна захавалася, калі б Злучаныя Штаты, іншыя ядзерныя дзяржавы Захаду разам з Расіяй не дамагліся б гэтага пасля распаду СССР? Адказ бачым у цяперашніх паводзінах



**Кім Чэн Ір і Лукашэнка прыйшлі да ўлады з розніцай у два дні.**

Пхеньяну.

Крытыка на адрас самай магутнай дзяржавы ў свеце — ЗША — дапамагае ўладарам дыктатарскіх рэжымаў самасцвярдзіцца, падвысіць аўтарытэт дзяржавы і свой уласны, прынамсі, ва ўласных вачах. А па-другое, ва ўмовах адсутнасці дыялогу з іншымі краінамі пагрозы і шантаж становяцца свайго роду заменай дыпламатыі. Пры Клінтану Кім Чэн Ір пайшоў на пэўныя саступкі (абяцаў нават адмовіцца ад праграмы стварэння балістычных ракет) у абмен на харчовую дапамогу. Пры Бушу-малодшым, які абяцаў націснуць на Пхеньян, каб той адмовіўся ад ядзернай праграмы, Злучаныя Штаты аслабілі гандлёвыя санкцыі супраць КНДР. Пхеньян жа, слухаючы крытыку з боку ААН і беручы ўдзел у «шасцібаковых мірных перамовах», працягваў упарта дамагацца мэты — стаць ядзернай дзяржавай. З якой хочаш не хочаш, а трэба лічыцца.

Невыпадкова новае ядзернае выпрабаванне ў Паўночнай Карэі адбылося пасля прыходу новага прэзідэнта ЗША Абамы. Гэта, так бы мовіць, дыпламатычны сігнал Вашынгтону: дапамажыце нам эканамічна, адмяніце ўсе санкцыі, а мы тады, магчыма, не станем развязваць самазабойчую атамную вайну.

Прыём шантажу, вядома, зусім не новы ў палітыцы. Можна ўзгадаць адключэнне Расіяй газавага транзіту праз Украіну ў Заходнюю Еўропу. Лукашэнка, напрыклад, раней неаднойчы палохаў Еўрасаюз тым, што адкрые мяжу для эмігрантаў і наркатрафіку. Прадметам шантажу і палітычнага гандлю з Захадам і Расіяй застаецца і магчымае прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі афіцыйным Мінскам.

Некаторыя лічаць, што палітыка дыпламатычных санкцый супраць Беларусі не апраўдала сябе. Але ж і палітыка самаізаляцыі таксама збанкрутавала. Прычым, у непасрэдным сэнсе слова — золатавалютныя рэзервы краіны зьмяншаюцца, запасы гатовай прадукцыі на складах растуць. Аднак, што будзе, калі спадзяванні на выхад з эканамічнага крызісу з дапамогай Еўропы не спраўдзяцца? Зноў хапацца за праверанаю зброю шантажу?

Прыклад Паўночнай Карэі паказвае, што гэтая зброя можа аказацца небяспечнай і для таго, хто ёй карыстаецца.

## ЦЫТАТЫ

### Змена вектараў

«Издревле близкий нам народ».

Загаловак газеты «Советская Белоруссия» да артыкулу, прысвечанага візіту міністра замежных справаў Ізраілю Авігдора Лібермана. А яшчэ нядаўна тыя самыя людзі спявалі «з братняю Руссю»...

### Трусы для сапраўдных герояў

«Нам трэба мяняць нацыянальныя тэзісы — «талерантныя», «памяркоўныя». Мы — нацыя герояў, трэба да гэтага прыходзіць. І бізнэсоўцы нароўні з нашымі спартоўцамі, музыкантамі, спевакамі павінны быць нашымі нацыянальнымі героямі. Калі ў масавай свядомасці мы будзем ведаць, хто мы ад каранёў нашых, што ў нас былі найбагацейшыя людзі ў Еўропе, што нам належала тэрыторыя ад Чорнага да Балтыйскага мора і быў перыяд, калі належала частка Расіі... Будзем нацыяй герояў!»

Уладальнік кампаніі па выпуску бялізны «Серж» Сяргей Атрошчанка на радыё tut.by




TUT.BY

# Самы славуты ананім



13 чэрвеня — 175 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Вераніцына — аўтара паэмы «Тарас на Парнасе». Піша **Язэп Янушкевіч**.

Яшчэ трыццаць гадоў таму гэта падалося б немажлівым: адзначаць юбілей аўтара «Тараса на Парнасе». Імя Канстанціна Вераніцына спакваля займае месца ў беларускай літаратуры. Ад самага таго дня 13 лістапада 1973 г., калі даследчык Генадзь Кісялёў адшукаў першыя згадкі пра яго ў Гістарычным архіве.

Яшчэ ў 1980-я ў школьных падручніках выгадней было трымацца думкі пра ананімнасць твора: не ставала доказаў на карысць якой-небудзь канкрэтнай асобы, хоць сакрэт аўтарства ляжаў на паверхні. Перашкаджала літаратуры палітыка. А менавіта яснае ўказанне на тое, што аўтарам «Тараса на Парнасе» быў Канстанцін Вераніцын, утрымлівалася ў рукапіснай хрэстаматыі беларускай літаратуры, якую ў другой палове XIX ст. складаў даследчык Аляксандр Рыпінскі. Тыя сшыткі Рыпінскага ў 1920-я захоўваліся ў прафесара Міхаіла Піятуховіча, які выкладаў у Беларускім дзяржуніверсітэце. Іх і пабачыў адзін з тагачасных студэнтаў, Антон Адамовіч, пазней знаны літаратуразнаўца, патрыярх беларускай эміграцыі ў ЗША. Дарэчы, у чэрвені спаўняецца сто гадоў і ад яго нараджэння.

Сшыткі Рыпінскага згубіліся ў ваенных пажарах. Але ўспаміны Адамовіча, цішком паказаныя Генадзю Кісялёву Максімам Лужанінам у пачатку 1970-х, далі штуршок да яго росшукаў. Спачатку Кісялёў быў пэўны, што «Вераніцын» — псеўданім. Таму шукаў па архівах звесткі пра ўсіх магчымых Канстанцінаў. І раптам у дакументах Горацкай земляробчай акадэміі за 1857—1858 гады знаходзіць звесткі пра найпершага выдатніка Канстанціна Вераніцына. Паступова вобраз аўтара «Тараса на Парнасе» паўстаў перад намі ў многіх падрабязнасцях.

Канстанцін Васілёў Вераніцын нарадзіўся 13 (1 па старым стылі) чэрвеня 1834 г. у вёсцы Астраўляны Віцебскага павету Віцебскай губерні (цяпер Гарадоцкі раён).

Быў ён па нараджэнні прыгонным, як і яшчэ адзін Тарас — украінец Шаўчэнка. Літаратуразнаўцы неаднойчы звязвалі з ім загаловак паэмы. Яшчэ Аляксандр Рыпінскі, перапісваючы «Тараса на Парнасе» ў свае сшыткі (гэтыя самаробныя рукапісныя хрэстаматыі непрызнанай і забароненай беларускай літаратуры паўставалі як народныя падручнікі), сцвярджаў: «Прыпавесць гэтая напісаная з нагоды нечаканага з'яўлення ў рускай літаратуры паэзіі простага маларасійскага казака Тараса Шаўчэнкі ў яго народнай гаворцы. Шмат нарабіў ён галасу».

Толькі Шаўчэнка, атрымаўшы адпускную, і надалей застаўся Шаўчэнкам. А наш паэт, меўшы першапачатковае прозвішча Васільеў, пасля атрымання «вольнай» ад свайго пана Васіля Бондырава (на думку Г.Кісялёва, не выключана, што наш Вераніцын быў яго пазашлюбным сынам), выбраў сабе прозвішча Вераніцын.

Атрыманая ад пана-бацькі вольная не стала адзінкавай успамогай 12-гадоваму хлопчыку. Ужо сын астраўлянскага ўладальніка, «адстаўны падпалкоўнік Міхал Бондыраў», 28 жніўня 1845 г. пісаў просьбу на імя інспектара вучэльняў у Віцебскай губерніі, каб падлетка «прынялі ў той клас, у які па іспыце вартым падасца ». Пасля сямігадовай вучобы ў гімназіі (1845—1852, а перад тым была Гарадоцкая парафіяльная школка) прага да навукі прывяла юнака ў Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію (1852—1854).

Вучоба ў Пецярбургу — вось чым тлумачыцца веданне «парнаскіх» рэалій з жывымі чуткамі пра Булгарына і Грэча, пра «Пушкіна, Лермантава з Жукоўскім ды Гогалем», гнуткі верш «пушкінскай паэтычнай школы», які гэтак зграбна загучаў у творы.

А потым была вучоба ў слыннай Горы-Горацкай «акадэміі», куды Кастусь Вераніцын паступіў ў 1857 г. адразу на трэці курс, а ў 1859 г. у ліку найлепшых студэнтаў скончыў «земляробчы інстытут» са званнем агранома, абараніўшы дысертацыю «Пра беларускую гаспадарку» («Знаць, і багі хазяйства водзяць, Калі свіней дзяржаць яны.»).

«Тарас на Парнасе» складаўся за часам пецярбургскага ды горацкага побыту. Паэма мае ў сабе рысы студэнцкага «капусніка», аналага сённяшніх «Камедзі-клабаў», толькі на непараўнальна вышэйшым інтэлектуальным узроўні. Разлічаная яна была на людзей адукаваных, знаёмых, прынамсі, са светам антычнай міфалогіі. Як сведчыў фальклярыст Еўдакім Раманаў, сяляне ўспрымалі паэму як «цікавую байку, але не для нашага розуму».

Выходзіць супярэчнасць: чаму Вераніцын, прадукт расійскай адукацыйнай сістэмы, які па-расійску ўвабраў у сябе веды і пра тую ж культуру Старажытнай Грэцыі і Рыму, піша паэму па-беларуску? Калі бальшыня насельнікаў краю не зможа яе ацаніць з прычыны няведання апісаных рэалій?

Спрацаваў, відаць, фактар Шаўчэнкі, жаданне паспрабаваць па-свойму наследаваць яму. І другое — наўрад ці ў дваццаць гадоў Вераніцын даў бы рады вольна выкладаць думкі па-расійску, тым больш вершамі. У XIX стагоддзі расійшчына яшчэ не здолела ўкараніцца ў мове тутэйшага люду ад Смаленчышыны і да Беласточчыны, ад Гомельшчыны і да роднай Вераніцыну Гарадоччыны на Віцебшчыне. Нават у мове звернутых у праваслаўе учарашніх уніятаў. Нават у абавязковых малітвах-пацерах, не кажучы аб штодзённай гаворцы. Як сведчаць тагачасныя запісы этнографа-фальклярыста Яна Карскага (дзядзька акадэміка), калі святар загадваў цягнуць «Госпадзі, памілуй», некаторыя сяляне адказвалі: «Мы не маскалі, каб спяваць «Госпадзі, памілуй!»... З пяці тысяч душ Лашанскай парафіі (радзіма Карскіх на Гродзеншчыне) хіба пяць чалавек (тысячная доля!) умела адгаварыць пацеры па-расійску.

Адзін з вядомых цяпер спісаў паэмы меў пазнаку «15 красавіка 1855 г., Гарадок». Твор, што пашыраўся ў сотнях, калі не тысячах спісаў (рукапіс, падпісаны псеўданімам «Навум» меў у сваім архіве Дунін-Марцінкевіч) толькі праз трыццаць гадоў трапіў на старонкі пазаштатнай газеткі «Минский листок» (1889). Вераніцыну на той час было 55 гадоў. Але ці выпадала пецярбургскаму чыноўніку Міністэрства шляхоў зносін выхваляцца аўтарствам? Дый хто мог тады ведаць, што твор, напісаны чатырохстопным ямбам пушкінскай школы, гэтак цудоўна ўпішацца ў беларускую паэтычную стыхію і стане візітнай карткай нашай адроджанай паэзіі. Адроджанай на новай беларускай літаратурай мове. І якім таямнічым выдалася яе нараджэнне, гэткім жа было і яе існаванне ў XX стагоддзі. Маю на ўвазе паэтычных «сястрыц» «Тараса на Парнасе» — паэмы «Сказ пра Лысую гару» (пачатак 1970-х) ды «Лука Мудзішчаў — прэзідэнт» (сярэдзіна 1990-х).

Дзе магіла Вераніцына ў Пецярбургу, як і дата ягонай смерці ў 1904(?) — невядомыя. Таму 13 чэрвеня можна адведаць на мінскай Кальварыі магілу даследчыка Генадзя Кісялёва.

Ён памёр 14 лістапада 2008 г., роўна праз 35 гадоў і адзін дзень пасля таго, як «на самага Кузьму-Дзям'яна» падараваў Беларусі яшчэ аднаго класіка Канстанціна Васілёва Вераніцына. А нам — магчымасць згадаць гэты юбілей.

*Ракаў, 6 чэрвеня 2009*

# Хатняя гульня зборнай Беларусі па мастацтве



Сёлета Беларусь (каторы раз) не трапіць у лік удзельнікаў найвялікшага сусветнага агляду дасягненняў сучаснага мастацтва — Венецыянскага Біенале. Але айчынныя мастакі гэтага так не пакінулі. І зладзілі беларускі павільён... у Мінску.

У экспазіцыі «Павільёну», што прайшоў у выстаўным комплексе «Белэкспа», былі прадстаўленыя творы 30 мастакоў, скульптараў і фатографаў розных пакаленняў, што працуюць у разнастайных накірунках актуальнага мастацтва. Сярод іх Сяргей Кірушчанка, Уладзімір Цэслер і Артур Клінаў, а таксама мастакі, якія ніколі яшчэ не выстаўляліся.

Выстава мусіла заявіць пра жыццёвую здольнасць і значнасць актуальнага беларускага мастацтва. «Паколькі мастацтва такая ж іміджавая рэч, як і спорт, дык, перакладаючы, Венецыянскі Біенале для любой краіны — гэта як мастацкая Алімпіяда, — кажа мастацтвазнаўца і куратар выставы Лізавета Міхальчук. — І калі тваёй краіны няма ў Венецыі, дык гэта адмоўна сведчыць пра ўзровень мастацтва ў ёй. Але ж мы не спрабавалі зрабіць «на злосць»: ні еўрапейцам, ні айчынным уладам. У нас налучылася цудоўная нагода прадэманстраваць беларускае мастацтва дома, і яе, спадзяюся, мы выкарысталі».

На выставе, якая мае такую правакацыйную назву, не абышлося без правакацыйных твораў. Мастак Канстанцін Гарэцкі выставіў твор «Мужчынскае сэрца любіць Бацькаўшчыну»: тэлевізар у кардоннай скрыні, які пад бадзёрыя гукі перадач радыё «Культура» паказвае мужчынскае начынне. «Дзе часам знаходзіцца сэрца мужчыны, мы ўсе цудоўна ведаем, — кажа Гарэцкі. — А Радзіму мужчыны любяць».

На пытанне, ці ж правакацыя не адцягне ўвагі наведнікаў ад іншых твораў, Л.Міхальчук адказвае: «Мы хочам паказаць увесь спектр беларускага мастацтва: і авангард, і поп-арт. За сценкай ад Гарэцкага, напрыклад, вісяць мілыя працы Аляксандра Бельскага (мастак-афармляльнік кінатэатру «Піянер»): рэкламы на фільмы, якіх не існуе».

Выстава працягнецца да 6 чэрвеня ўключна. Уваход на «Беларускі павільён Венецыянскага Біенале» — вольны.

**ЛК**

# 40 гадзін Караткевіча




У мінскай Пушкінскай бібліятэцы адбылася прэзентацыя раману Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» у аўдыёфармаце. Гаваркая кніга складаецца з двух дыскаў, блізу 40 гадзін гучання.

Тэкст раману чытае Андрэй Каляда, выкладчык сцэнічнай мовы.

У кампаніі «БелТонМедыя», што выдала кружэлку, даводзяць: дзякуючы падобным дыскам, моладзь, жывучы ў амаль татальным рускамоўі, мае мажлівасць чуць беларускую мову. Хаця, бывае, купляюць і з іншых прычынаў. Распавядае Алесь Калоша, дырэктар «БелТонМедыя»: «Адразу пасля выхаду дыску да нас пазваніла маладая асоба з пытаннем, дзе набыць кружэлку. Я адказаў, што дыск будзе ў краме «Акадэмкніга». Праз дзень дзяўчына тэлефануе мала не з плачам «У той кнігарні няма, а ў мяне хутка экзамен!»

«БелТонМедыя» супольна з рэжысёрам Валерам Мазынскім ужо выдала 30 дыскаў, сярод якіх айчынныя і замежныя творы — Коласа, Арлова, Оруэла... У найбліжэйшых планах «Маленькі Прынц» Сэнт-Экзюпэры і Караткевічаў «Чорны замак Альшанскі».

**Лявон К.**

# Хто там ідзе? (пасля доктара Хаўза)

Якія новыя серыялы набіраюць папулярнасць? Піша **Павал Касцюкевіч**.

Ролік у YouTube'і, дзе бандзюкаватыя жыхары Гарлемуназіраюць па тэлевізары за пацалункам доктара Хаўза з галоўдоктарам Кадзі, сабраў вялізарную колькасць праглядаў, не кажучы пра саму новую частку папулярнага серыялу. Хоць «Доктар Хаўз» па-ранейшаму на кані, але адчуліся прызнакі распаду: сюжэтныя лініі паўтараюцца і набіваюць аскоміну ці, наадварот — як у выпадку з пацалункам, — лятуць ў дзікія вышыні. Аматары якасных серыялаў пакрысе сталі гутарыць пра новую крыніцу свайго натхнення. І хай паралельна досыць паспяхова ідуць дзядулі-ветэраны, «Сімпсаны» і «Саўс Парк», гледачам хочацца чагосьці навюткага. Такім парадкам, хто заступіць «Доктара Хаўза»?



### Занадта ідэальны, каб быць Хаўзам

**Серыял «Схлусі мне»** (рус. «Теория лжи», анг. Lie to Me). Выйшаў на экраны ў студзені 2009 г., цяпер ідзе 1–ы сезон.

Аналітычная група на чале з Колам Лайтмэнам расследуе крымінальныя справы. Лайтмэнаўцы — спецыялісты па тлумачэнні мімікі і мовы цела сведкаў і меркаваных злачынцаў.

Усе выдуманыя гісторыі ў серыяле «Схлусі мне» дублююцца рэальнымі кадрамі з сусветнай палітыкі: Біл Клінтан, калі ён хлусіў амерыканскаму народу, што ў яго не было ніякай сувязі з Монікай Левінскі, дакранаецца да вуснаў, або Буш са сваёй няпраўдай пра атамныя распрацоўкі Іракцаў у часе публічнай прамовы робіць жэсты, якія выдаюць яго з вантробамі.

Герой Ціма Рота, выканаўцы галоўных роляў у «Шалёных псюках» і «Чатырох пакоях», — не раўнуючы, як Хаўз, таленавіты ў сваёй справе адмысловец, такі ж дэманічны і дэспатычны, такі ж люты да падначаленых і ўсіх астатніх і такі ж агідны аж да прыцягальнасці. Чаго бракуе? У натуры спеца Лайтмэна няма чарваточынкі, уласнай праблемы, якая так вабіць у грэхаводным доктары. У Лайтмэна сям'я, дачка, ён не наркаман, не хуліган, але серыял дынамічны, і маем асалоду пачакаць, паназіраць за развіццём характару галоўнага героя: Хаўзамі не нараджаюцца.



### Чатыры ціхіні і бландынка

**Серыял «Тэорыя вялікага выбуху»** (анг. The Big Bang Theory). Першы сезон выйшаў на экраны ў 2007 г. Цяпер скончыўся 2–і сезон.

Камерная, але дасціпная камедыя сітуацыяў. Серыял пра жыццё чатырох маладых фізікаў, дзе рупліва эксплуатуюцца ўсе стэрэатыпы наконт батаніка-акулярыкаў.




Вось Шэлдан, які з аднаго боку атрымаў годнасць доктара-фізіка ў 15 гадоў, але з іншага — абсалютна нямоглы ў штодзённым жыцці: нечуллівы сноб з поўнай адсутнасцю пачуцця гумару.

Говард Волавіц — дамарослы жыгала, які дагэтуль жыве з дэспатычнай маткай (вядома, сам Волавіц сцвярджае, што мама жыве з ім).

А вось фізіку індыйскага паходжання Раджэшу забірае мову, калі да яго набліжаецца жанчына. І, каб падсцябнуць сюжэт, стваральнікі серыялу вырашылі пасяліць побач з фізікамі эфектную 100-адсоткавую бландынку Пэні, якая працуе афіцыянткай. Вельмі-вельмі непасрэднае дзяўчо, поўная процілегласць чацвёрцы фізікаў-надхмаршчыкаў, якая, нягледзячы на завумныя выбрыкі ціхоняў, пакрысе, уцяміўшы іх жарты і лад жыцця, робіцца іх найлепшай сяброўкай.

Выснова: геніі таксама людзі... тыя яшчэ людзі.

Каб паглядзець гэтыя серыялы, не абавязкова чакаць пакуль БТ або расійскія каналы закупяць чарговы сезон. Цяпер іх можна набыць на кніжных кірамашах: серыялы там прадаюць разам з поўнаметражнымі стужкамі.

### Квітнеючы вясёлы арганізм

**серыял «Сабакакот», або «Котасабака»** (анг. — CatDog). Серыял ішоў з 1998 г. да 2004 г.

Гэты неаблашчаны у свой час увагай айчыннага гледача серыял цяпер, дзякуючы беларускаму філіялу MTV, перажывае свой трыумфальны камбэк.

Мультыплікатары, пэўна, паддаліся пачуццю цікаўнасці: што будзе, калі злучыць двух найлепшых сяброў чалавека ў адзін квітнеючы вясёлы арганізм. Выйшла стракатая і месцамі псіхадэлічна: карыстаючыся перавагамі сваёй дзвюхадзінай прыроды, сабакакот тушыць пажары, расследуе забойствы і ратуе свет. Напрыклад, дыктатар краіны жывёлаў, зялёны трус, уводзіць абавязковае ліцэнзаванне для ўсіх звяроў, кшталту «Дакажы, што ты не вярблюд». Кот ліцэнзаванне праходзіць (ён хітрэйшы), а яго сабачая частка — не. Палову цела сабакаката садзяць у турму. Але дзякуючы таму, што другую палову ўсё ж не пасадзілі, дык сабака праз агульны страўнік пасылае запісачку кату на волю, а той перасылае назад пілу, вызваляе не толькі частку свайго цела, але адным захадам і іншых жывёлаў-вязняў.

**П.С.** Жывы курылка! У «Саўс Парку», дарэчы, нядаўна была абсалютна камедыйная серыя пра змрочны бок дзіцячых герояў: Мікі Маўс на пасадзе дырэктара кінакампаніі бязлітасна лупцуе за найменшае непадпарадкаванне сваіх падначаленых людзей.

# Чароўны трусік Юрыя Дземідовіча

Канец свету блізкі. Пра гэта сведчыць абсалютна апакаліптычная песня Юрыя Дземідовіча з паўфіналу «Дзіцячага Еўрабачання». З хардкоравымі устаўкамі, харальнымі спевамі і гіпнатычным рэчытатывам, якую, здаецца, не ўсведамляючы робленага, спявае звычайна-айчынны вялікавокі хлопчык. Абсалютна непадумна, адкуль у «дзіцячым Еўрабачанні», святая святых прыстойнай гламурнасці, з'явіўся тагасветны трусік, які «выводзіць крэйдай плюсік, пенснэ надзявае, лаціну вывучае».

Пакуль дарослыя інфантылы спаборнічаюць, хто вынайдзе найсаладжавую «Казку» для дарослых, 13-гадовы Юра Дземідовіч адбамбіў для дзіцячага еўрабачання абсалютна недзіцячую, як перастроечная чарнуха, хіцяру, ад якой касцянее сэрца.

Ролік з песняй Дземідовіча выклікаў цэлую буру каментароў у інтэрнэце. Падаем наяскравейшыя:

«Ужо ўсе бачылі нашага беларускага хлопчыка, які выпадкова выклікаў Д'ябла?»

«Гэта самае арыгінальнае здарэнне з беларускай эстрадай ад часоў «Песняроў».

«Ялфімаў у пралёце».

«Хлопчык збіраецца выканаць на дзіцячай версіі Eurovision песню, якую Дэвід Тыбет вытужваецца напісаць з часоў Imperium. Вось толькі за плячыма Тыбета — акультызм, наркотыкі, лонданскі андэграўнд канца 70-х і нязменная рэлігійная экзальтацыя з нагоды знаёмства з кожнай новай ерасcю. За плячыма ж хлопчыка — толькі той самы «нулік»...»

Уся культсітуацыя ў Беларусі пасля «Чароўнага трусіка» перамянілася: багну, якая ўфармавалася ў старым жалезным вядры, міжволі бязлітасна разгойдаў адзін чалавечак. І не раўнуючы кэралаўскія, беларускія Алесі цяпер неспадзёўкі апынуліся ў царстве чароўнага трусіка, у дзівоснай краіне са знакам «нулік» (хіба ў беларускім перакладзе «са знакам плюсік»). Залюстроўе, ці што... Усё, кідаю пісаць — мне страшна.

**Павал Касцюкевіч**



# Кандыдат на ўсе вакансіі

**У сваім цыкле «Палітбюро–2009» Аляксандр Фядута піша пра віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашку.**

Калі пасля адстаўкі Генадзя Навіцкага з посту старшыні ўраду надарылася доўгая кадравая «паўза», дэпутат Вольга Абрамава спытала ў в.а. прэм'ер-міністра Уладзіміра Сямашкі, што прыйшоў прадстаўляць у парламент ледзь не бюджэт: «Ці варта разумець, Уладзімір Ільіч, што мы гаворым з будучым прэм'ерам?»

Уладзімір Ільіч толькі шматзначна ўсміхнуўся ў адказ. У той момант ён, імаверна, ужо ведаў, што прэм'ерам будзе Сяргей Сідорскі, і — што вельмі падобна да праўды — радаваўся гэтаму.

## Апошні дырэктар ва ўладзе

Кар'ера Сямашкі тыповая і нетыповая адначасова. Нетыповая для лукашэнкаўскай эпохі — бо не магілёўскі (з Гомельшчыны), не аграрый, у перадвыбарчых кампаніях не ўдзельнічаў і дэпутатам аднаго з будучым прэзідэнтам скліканне не выбіраўся. Тыповая — бо менавіта так развіваліся кар'еры ў далукашэнкаўскую эпоху. Так, у свой час гендырэктар Мінскага вытворчага трактарнага аб'яднання Мікалай Слюнькоў стаў спачатку старшынёй Мінскага гаркаму КПБ, а потым паехала... Не кажучы пра кебічаўскую кароткачасовую вольніцу: за дарагім Вячаславам Францавічам акурат дырэктары і мелі найбольшы шанец стаць чальцамі ўраду — абы жаданне было.

22 гады адпрацаваўшы на родным «Інтэграле» і даслужыўшыся там да галоўнага інжынера, у 1996 г. Уладзімір Сямашка (па чутках, з падачы аднаго з ключавых тады гульцоў Васіля Даўгалёва) быў прызначаны дырэктарам ВА «Гарызонт». Там Сямашка і паказаў сябе — наколькі гэта магчыма на крызісным прадпрыемстве. Менавіта яму давялося ўдзельнічаць у рэалізацыі памятнай нам усім праграмы «Саюзны тэлевізар» — гэта калі браты-беларусы ўпарвалі братам-расійцам беларускую тэхніку па цане, вышэйшай за японскую, ды яшчэ і мелі прэферэнцыі на расійскім рынку. «Віцязь» так выцягнуць з яміны не здолелі. А вось «Гарызонт» здолелі, прычым роля дырэктара была даволі значнай. Праўда, пасля сыходу Сямашкі ва ўрад пра поспехі мінскіх «скрынебудаўнікоў» зноў казаць чамусьці перасталі. Аднак, калі ў 2001 г. «Ільіча» зрабілі міністрам энергетыкі, гэта нікога не здзівіла. Ён меў рэпутацыю добрага (па беларускіх панятках) мэнэджара.

Пазіцыі Даўгалёва, які калі і апекаваўся нейкі час Сямашкам, да таго часу пахіснуліся: з пасады брэсцкага губернатара на кадравыя пытанні ва ўрадзе не вельмі і паўплываеш. Кажуць, Сямашка на пасадзе міністра апынуўся таму, што спатрэбілася «выбіць» галіну з-пад нефармальнага кантролю Міхаіла Мясніковіча, чыё імя яшчэ з кебічаўскіх часоў чамусьці трывала асацыявалася з расійскай газавай «трубой» і пастаўкамі электраэнергіі.

Так замест самавітага чыноўніка Мясніковіча, пасівелага ў дыпламатычных перамовах з расійскай энергетычнай элітай, беларуская энергетыка атрымала бадзёрага, энергічнага дырэктара, які хутка пераняў манеры лідэра дзяржавы. Прынамсі, калі абазнаныя людзі пераказваюць уражанне важнага старшыні «Газпрому» Аляксея Мілера ад стасавання з віцэ-прэм'ерам беларускага ўраду (з 2003 г.) Уладзімірам Сямашкам, міжволі згадваеш шок Віктара Чарнамырдзіна ад першай сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам: «Мяне даўно ніхто не называў Віцем».

## У адзіным шыхце «младатуркаў»

Дыялог Вольгі Абрамавай з Уладзімірам Сямашкам, з якога мы і пачалі наш нарыс, быў хутчэй фармальным. На той момант — у снежні 2003 г. — Сямашка добра ведаў, што прэм'ер-міністрам Беларусі будзе не ён. Ішла сур'ёзная пазіцыйная барацьба груповак у прэзідэнцкім атачэнні. Віктар Шэйман і Уладзімір Канаплёў, Урал Латыпаў і Анатоль Тозік — кожны меў свае ўяўленні пра тое, хто можа і павінен узначаліць урад, зрабіўшыся другой асобай у сістэме выканаўчай улады. Сямашка і не мог спадзявацца на тое, што яго кандыдатура будзе рэальна разглядацца. Што адбываецца ў такіх выпадках з людзьмі, якія спрабуюць «высунуць», можна меркаваць па больш познім прыкладзе старшыні канцэрну «Белнафтахім» Аляксандра Бароўскага: па чутках, спроба аднаго з «гульцоў» ператварыць Бароўскага ў рэальную альтэрнатыву Сяргею Сідорскаму каштавала Бароўскаму і пасады, і свабоды. А Сямашка свабоду цаніць умеў.

Трэба было вызначацца, з кім ён — з «разумнымі» ці з «прыгожымі». Сямашка аддаў перавагу «разумным», што выразілася ў яго дабравольнай блакіроўцы з кланам так званых «младатуркаў», ідэйным натхняльнікам якіх журналісты традыцыйна лічылі тагачаснага старшыню Камітэту дзяржкантролю Анатоля Тозіка, а тварам — Сяргея Сідорскага.

Менавіта супраць «младатуркаў» у беларускай уладзе быў скіраваны памятны пасаж аднаго з ідэолагаў крамлёўскага рэжыму: маўляў, у Мінску акапаліся нацыяналісты. Пасаж быў правамерны і смешны адначасова. Бо паводле ўласна беларускіх паняткаў, нацыяналістамі лічыліся зусім іншыя людзі, зусім не тыя, што сядзелі ва ўрадавых кабінетах.

«Нацыяналізмам» расійскія партнёры па перамовах лічылі няздольнасць гэтай групы саступаць у пытаннях беларускай уласнасці на найбуйнейшыя дзяржаўныя прадпрыемствы. Ідэя разліку за расійскія эфемерныя, то бок тыя, што таюць па меры выкарыстання — энерганосьбіты акцыямі беларускага «фамільнага срэбра» не праходзіла. Ні Сідорскі, ні Сямашка на гэта ўпарта не пагаджаліся. Прычым не толькі таму, што так хацеў прэзідэнт, які накіраваў іх на перамовы, але і іх уласная пазіцыя з гэтым супадала. Іх нацыяналізм насіў не культурна-палітычны, а эканамічны характар. З украінцамі было зразумела: кажуць, старшыня «Нафтагазу Украіны» Аляксей Івчанка перакладчыка з сабой вазіў у Маскву, каб прадэманстраваць суверэнітэт. А тут і гаварылі, здаецца, на адной мове, і па чарцы (імаверна) прапусцілі — а сарвалася!



PHOTO.BYMEDIA.NET

І зрывалася шторазу, пакуль гаворка пра беларускую газатранспартную сістэму не перайшла на мову ультыматумаў. Але і тады галоўны перамоўшчык з беларускага боку, Уладзімір Сямашка, упарта вынаходзіў хады, якія дазвалялі афіцыйнаму Мінску проста ці ўскосна кантраляваць «трубу». І тым самым урэзаць сваё імя ў памяць расійскіх «таварышаў» настолькі, што адна думка пра яго прызначэнне на пост прэм'ера і ператварэнне ў кандыдата ў пераемнікі непакорнага «бацькі» змушала расійскіх урадавых аналітыкаў раздзімаць ноздры.

Несаступлівы Сямашка ствараў магчымасць для Лукашэнкі сыграць ролю «белага і пухнатага» саюзніка. Хочаце, каб прэзідэнт Беларусі ўмяшаўся? Ну, пагадзіцеся з яго асабістымі патрабаваннямі. Ну, што вам варта, сябры маскалі? Мільярд туды, мільярд сюды — ад вас не ўбудзе, га?!

## Сцяжына Сямашкі

Вуліца Сямашкі ў Мінску, вядома, ёсць. І, вядома, не ў гонар віцэ-прэм'ера была яна названая. Але гаворка зараз не пра яе.

Гаворка пра шлях прыватызацыі дзяржаўнай прамысловасці, які, паводле чутак, пракладае першы віцэ-прэм'ер па сённяшні дзень. Менавіта Уладзіміру Ільічу належыць ідэя «канцэрнізацыі» ўсёй краіны з акцыянаваннем спачатку не асобных прадпрыемстваў, а цэлых галінаў. Беларусь з-за перамогі Лукашэнкі ў 1994 г. паспяхова мінула стадыю стварэння інвестыцыйных фондаў, што за паперкі атрымлівалі ласыя кавалкі эканомікі (мадэль Чубайса — памятаеце такога?). Але прыватызацыю ўсё адно трэ было рабіць і рынак каштоўных папер ствараць, інакш інвестара не прыцягнеш. Масавае стварэнне канцэрнаў — гэта перадача пад кантроль чыноўнікаў найбольш выгадных у фінансавых адносінах галін і прадпрыемстваў. А паколькі фармальна гэта ўжо будуць не зусім чыноўнікі, але, так скажам, «дзяржаўныя прадпрымальнікі», у іх ёсць усе шанцы сканцэнтраваць у сваіх руках рэальную ўладу над... над уладай, як бы парадаксальна гэта ні гучала. Але тут мы зноў прыходзім да сумных успамінаў пра лёс Бароўскага. І тое, што Сямашка дагэтуль застаецца другой асобай ва ўрадзе, ды яшчэ і на волі пры гэтым, кажа пра галоўнае: улада эканомікі над палітыкай, паспяхова рэалізаваная ў Расіі часоў позняга Барыса Ельцына, у нашай краіне, за Лукашэнкам — фармалізаваная будзе не хутка. Сямашка, што кантралюе беларускую энергетыку і сур'ёзную частку прамысловасці, не жадае рабіцца прыватнай асобай з статусам уласніка. Мэнэджэр — калі ласка. Не парадным праспектам ехаць, паганяючы фурмана, а пратаптанай сцяжынай ісці да пэўнай мэты. Толькі так у нашым палітычным лесе і можна ацалець.

Затое гэты акуратны і фармальна не амбітны рух уласным шляхам дае Сямашку рэальную магчымасць настойваць на сваім нават тады, калі іншыя адступаюць. Скажам, ён адзіны прадстаўнік ураду, які жорстка супярэчыць падчас нарадаў памочніку прэзідэнта па пытаннях эканомікі Сяргею Ткачову. Прычым аргумент яго просты: «Усё б Вам, Сяргей Паўлавіч, паперкі пісаць. А нам працаваць».

Працаваць Сямашка гатовы. Але ўласнай скурай адказваць за чужыя тэарэтычныя пралікі і — чаго там ужо — свядомыя рашэнні — не! Лепш звальняйце!

А звольніць складана. Бо замяніць пакуль няма кім.

## У атачэнні «ваўчанятаў»

Сваіх амбіцый Уладзімір Сямашка ніколі не хаваў. Дакладней, іх мяжы. Усе ведалі, што ён ніколі не разглядаў сябе ў якасці кандыдата ў прэзідэнты. І яго ніхто ніколі ў гэтай якасці не разглядаў. Таму ён быў і застаецца зручнай фігурай для пабудовы разнастайных камбінацый, падчас якіх яму адводзіцца месца прэм'ера.

Скажам, у чарговы раз пранеслася чутка пра ўжо заўтрашнюю адстаўку Сідорскага. І ў прыёмнай у Сямашкі адразу ж высаджваецца «дэсант» з ліку «зацікаўленых», цвёрда пэўных, што ў выпадку ўзвышэння Уладзімір Ільіч пра іх не забудзецца.

Або, наадварот, пачалі казаць пра ўмацаванне пазіцый Сідорскага, пра тое, што ўжо заўтра абвесцяць яго спадкаемцам «бацькі». І адразу нібы рой загудзе ў прыёмнай ... не, не ў Сідорскага, а ў Сямашкі, бо лічыцца, што менавіта ён узначаліць пры прэзідэнце Сідорскім урад Беларусі.

Ці то «ваўчаняты» ўгрызаюцца ў горла «старых паплечнікаў», ці то «младатуркі» змагаюцца з «ваўчынай зграяй» — Сямашка падаецца спакойным і пэўным у заўтрашнім дні.

І не проста пэўным.

Ён настолькі далёкі ад таго, што прынята называць «публічнай палітыкай», што нават быўшы кіраўніком беларускай дэлегацыі на нядаўнім саміце «Усходняга партнёрства» ў Празе, як кажуць відавочцы, не стаў фатаграфавацца сярод кіраўнікоў іншых дэлегацый — пераважна прэзідэнтаў і прэм'ераў, — хоць месца для беларуса было пакінутае.

Дасведчаны Сямашка, разумее, што менавіта яму не па чыне. Калі ж параіў яму хітрамудры Сяргей Мартынаў (паводле чутак, таксама блізкі да «младатуркаў»), тады відаць, што хапае ў Сямашкі розуму слухаць такога дарадцу.

Так што ёсць некаторая нават упэўненасць, што пасля ад'езду Сідорскага ў месцы настолькі аддаленыя, куды адных паслоў і пасылаюць, менавіта Сямашка мае ўсе шанцы ўрад узначаліць — нягледзячы на агульнае амаладжэнне мэнэджэрскай каманды, якая падпірае «ягамосць». Яно і вядома: Лукашэнка не любіць новых твараў на чале Саўміну (апёкшыся на Чыгіры, і на Лінга дзьмуць будзеш). Калі гэта адбудзецца, нефармальны статус Сямашкі, ключавога гульца на полі эканомікі будзе нарэшце фармалізаваны.

І тады ажыццявіцца запаветная мара прамыслоўцаў, якія ніяк не могуць развеяць пашыраны міф пра «аграрны» характар нашай краіны. У гэтым разе рэальным кандыдатам ад улады на наступных прэзідэнцкіх выбарах стане «дырэктар са скрыні». Дый яго прэм'ерства будзе (калі адбудзецца) дакладнай прыкметай таго, што «фамільнае срэбра», успадкаванае суверэннай Беларуссю ад Савецкага Саюзу, не раскрадуць і не здадуць Расіі задарма. Бо Сямашка даказаў: удар трымаць ён умее.

А калі і з'явіцца калі-небудзь алігарх з прозвішчам Сямашка, дык, падобна, ён будзе не найгоршым гаспадаром.

**Аляксандр Фядута,**
**спецыяльна для «НН»**

**Раней у цыкле:**

«Уладзімір Макей. Другі твар» № 14

«Наталля Пяткевіч. Русалка на аблоках» №16

«Юры Жадобін. Генерал мірнага часу» №17

«Сяргей Ткачоў. Чалавек–невідзімка» №18

«Пётр Пракаповіч. Будаўнік у банку» № 20

Наступная публікацыя будзе прысвечаная Андрэю Кабякову.

# Мясніковіч нарэшце стаў членкарам

**Членкарам таксама стаў бацька галоўнага ідэолага краіны Усевалада Янчэўскага.**

5 чэрвеня у НАН абіралі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў. Усяго з'явіліся 11 новых акадэмікаў і 24 члены-карэспандэнты.

Каб стаць акадэмікам, трэба набраць 2/3 галасоў, прычым за акадэмікаў галасуюць толькі акадэмікі, а за членаў-карэспандэнтаў — і акадэмікі, і члены-карэспандэнты.

Сярод новых акадэмікаў — рэктар БДУ Сяргей Абламейка — у галіне інфармацыйных тэхналогій; дырэктар РНВЦ «Кардыялогія» Аляксандр Мрочак — кардыялогія; рэктар БНТУ Барыс Хрусталёў — машынабудаванне.

Стаў акадэмікам і дырэктар НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі Міністэрства аховы здароўя Арнольд Смеяновіч — у галіне нейрахірургіі. Менавіта ён нядаўна зрабіў аперацыю мэру Мінска Міхаілу Паўлаву.

Гонар стаць новымі членамі-карэспандэнтамі АН заслужылі, сярод іншых:

Юрый Дзямідчык, дырэктар Рэспубліканскага цэнтру пухлінаў шчытавіднай залозы, чалавек, дзякуючы якому тысячы беларусаў з дыягназам «рак шчытавіднай залозы» засталіся жывыя, — у галіне анкаэндакрыналогіі;

Зянон Лоўкіс, гендырэктар РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН па харчаванні» — тэхналогія вытворчасці прадуктаў харчавання;

Аляксандр Лукашанец, дырэктар Інстытуту мовазнаўства НАН, адзін з ідэолагаў прыняцця новых правілаў беларускай мовы — беларуская мова;

Юрый Астроўскі — вядомы беларускі кардыяхірург, адзін з фігурантаў крымінальнай «справы дактароў» — кардыяхірургія;

Сяргей Рахманаў, першы прарэктар БДУ, чалавек, пры ўдзеле якога з пасады рэктара прыбіралі Аляксандра Казуліна, — хімія цвёрдага цела;

Аляксей Скакун, старшыня СВК «Астрамечава» Брэсцкага раёну — эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай, АПК;



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Аляксандр Сукала, адзін з найвядомейшых беларускіх педыятраў, спецыяліст па дзіцячай нефралогіі — педыятрыя;

Міхаіл Мясніковіч, старшыня прэзідыюму Акадэміі навук — эканоміка. Урэшце галоўны навуковец краіны па афіцыйным статусе атрымаў статус і ў навуковым асяроддзі. Раней акадэмікі ўпарта «пракатвалі» яго падчас галасаванняў.

Стаў членкарам і Вячаслаў Янчэўскі, загадчык аддзелу алгебры Інстытуту матэматыкі НАН, у галіне алгебраічнай геаметрыі. Дарэчы, бацька памочніка прэзідэнта па ідэалогіі Усевалада Янчэўскага.

«Прахадным балам» лічыліся 114 галасоў. Міхаіл Мясніковіч перамог трыюмфальна. За старшыню прэзідыюму Акадэміі навук са 168 чалавек «за» прагаласавала 147, 18 — супраць, тры бюлетэні прызнаныя несапраўднымі.

Генпракурору Васілевічу, намесніку міністра эканомікі Туру і старшыні Віцебскага аблвыканкаму Касінцу давялося не па сваёй волі зняцца з выбараў. Іх кандыдатуры павінен быў ухваліць кіраўнік дзяржавы, хаця, як падкрэсліваюць самі акадэмікі, у статуце гэта не прапісана. На профільных аддзяленнях іх абралі кандыдатамі ў члены-карэспандэнты, але прэзідыюм Акадэміі навук прыняў пастанову аб тым, што яны павінны атрымаць санкцыю кіраўніка дзяржавы. У кулуарах Акадэміі навук кажуць, што іх расчараванне было бязмежнае...

**Belaruspartisan.org**

## СЦІСЛА

### КДБ арыштаваў дырэктара ААТ «Гомельшкло»

Паводле папярэдняй інфармацыі, Юрыя Ільева вінаваціць у перавышэнні паўнамоцтваў і атрыманні хабару. «Гомельшкло» не першы раз трапляе ў поле зроку праваахоўных органаў. У 2000 г. яго дырэктара Уладзіміра Запольскага застрэлілі ў пад'ездзе ўласнага дома.

### Ёсць яшчэ жанчыны і ў нашых вёсках

«Нацягнуўшы кажух, валёнкі, тоўстыя рукавіцы, каб не пацярпець у выпадку ўкусу шалёнае жывёліны, выдварыла нязваную госцю», — расказвае «Народная газета» пра жыхарку Клімавіцкага раёну, сын якой сп'яну прынёс у хату жывую лісу. Сябры аглушылі яе ўдарам дошкі па галаве. Ачуняўшы, ліса ўкусіла хлопца. Аказалася, звер быў шалёны. Сына ўратаваць не ўдалося.

**МБ**

# Каму паставіць помнікі Міністэрства культуры?

Працяг са старонкі 1.

**Гродзенская вобласць:**
пісьменнік **Францішак Багушэвіч** (Смаргонь).
кароль **Міндоўг** (Навагрудак);
дзяржаўны дзеяч **Антоній Тызенгаўз** (Гродна).
**Магілёўская вобласць:**
генерал, камандзір 1-ай пяхотнай дывізіі Войска Польскага **Зыгмунт Берлінг** у Горацкім раёне;
адзін з арганізатараў падпольнага руху **Фёдар Крыловіч** (Асіповічы);
пісьменнік **Аркадзь Куляшоў** (Касцюковічы);
заснавальнік гораду князь **Расціслаў Мсціслававіч** (Мсціслаў).

Прадстаўнікі Гомельскай вобласці прапанавалі мноства бюстаў, але варыянтаў на ўшанаванне асобаў у помніках не знайшлі.

### Удакладненні ад Акадэміі навук

Разам з тым Акадэмія навук прапанавала яшчэ 100 кандыдатур на ўшанаванне. Тут ёсць і Вітаўт, і Леў Сапега, і Каліноўскі, і трое Радзівілаў у Нясвіжы... Ці то наўмысна, ці то не, аж два помнікі прапануецца паставіць Аляксандру Чарвякову. Сярод дзеячоў другой паловы XX ст. сустракаюцца Кандрат Крапіва, Андрэй Макаёнак, Кірыл Мазураў.

Прапанову АН можна лічыць адной з першых афіцыйных спробаў скласці шырокі спіс вартых асобаў з гісторыі Беларусі. Магчыма, пералік зможа ўзбраенне камітэты па пераймянаваннях.

Можна шукаць у спісах недахопы: напрыклад, адсутнічае постаць Васіля Быкава. Але калі намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка са шкадаваннем зазначае, што ў Беларусі няма ніводнага помніка Касцюшку, — гэта таксама знак. Здаецца, улады прапануюць кампрамісны, з іх пункту гледжання, варыянт: не чапаць савецкія помнікі (Ленінаў, Дзяржынскіх), а ставіць побач і новыя, беларускія.

### «Вашае меркаванне будзе ўлічанае»

Мінкульт прапануе арганізацыям і грамадзянам уступаць у дыскусію наконт асобаў, вартых ушанавання. Цяжка сказаць, ці будзе ўлічваца меркаванне альтэрнатыўнага боку, але можна не сумнявацца, што і Таварыства беларускай мовы, і іншыя грамадскія аб'яднанні паспрабуюць выставіць кандыдатуры.

**Ягор Марціновіч**

# Кватэрнае пытанне

**Стаянне ў чарзе на будаўніцтва кватэры па льготных цэнах можа працягвацца гадамі. Хутчэй — дзесяцігоддзямі. Яшчэ б! Цяпер у чарзе на паляпшэнне жылля стаяць больш за 700 тысяч сем'яў па ўсёй Беларусі.**

### Колькасць ахвотных

Тэмпы будаўніцтва жылля ў краіне павялічваюцца , вось і чарга нарэшце пачала змяншацца — на 2,4% за папярэдні год. Цяпер яна складае 701 тысячу чалавек. Толькі ў Мінску ахвотнікаў пабудаваць кватэру ўсё большае. Кожны трэці ахвотнік — мінчанін. За 2008 год да сталічнай чаргі далучыліся 26 тысяч чалавек. Тое, што Мінск «назбіраў» за год, складае пятнаццацігадовую чаргу Магілёва... Рост чаргі тлумачыцца прытокам людзей з правінцыі «за лепшым жыццём» і стварэннем штучнай патрэбы на жыллё. Зарэгістраваць у сябе бабульку з вёскі — вось і недахоп метраў, можна станавіцца ў чаргу. Развод — вось яшчэ дадатковы чалавек у спісе.

### Працягласць чаргі

Тут таксама Мінск — відавочны рэкардсмен. Дазвол на пабудову атрымалі яшчэ не ўсе, хто зарэгістраваўся за Савецкім Саюзам. У абласных цэнтрах розныя тэмпы будаўніцтва. Нядрэнная сітуацыя ў Віцебску, у якім чарга меншая за пяць год. Раённыя цэнтры, у якіх яшчэ будуюць шматкватэрныя дамы, са сваёй чаргой амаль разабраліся, чаканне таксама не перавышае пяці гадоў. Перад такімі гарадамі праблема жылля вострa не стаіць.

| Горад | Колькасць ахвотных | Працягласць чаргі | Прыблізны кошт за м$^2$ |
|---|---|---|---|
| Мінск | 247 000 | 1987—1988 | 1,4—2,16 млн |
| Гродна | 72 000 | 2000 | 1,1—1,4 млн |
| Гомель | 46 000 | 1996 | 1,4 млн |
| Брэст | 33 000 | 1993—1994 | 1,4 млн |
| Віцебск | 27 000 | 2005 | 1,4—1,8 млн |
| Магілёў | 26 000 | 1995 | 1,2 млн |



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Кошт жылля

Кошт квадратнага метра ў камерцыйным жыллі па Беларусі складае ў сярэднім каля 1000 даляраў. З дапамогай дзяржавы можна пабудаваць кватэру ў паўтара-два разы танней. Тыя цэны, якія ўсталёўваюць мясцовыя выканаўчыя камітэты, не нашмат, але ўсё ж розняцца.

У Гродне жыллё самае таннае, таму і атрымаць яго імкнецца шмат людзей. У Віцебску сваіх ахвотнікаў палохаюць больш высокімі цэнамі. Як вынік, чаргі амаль няма.

Усяго ж у гэтым годзе бюджэтам выдзелена на льготнае будаўніцтва 1,25 мільярда даляраў па ўсёй краіне.

### Што трэба, каб стаць у чаргу?

Пытанні, звязаныя з чаргой на жыллё, рэгулююцца прэзідэнцкім указам №565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносінаў».

Асноўнае патрабаванне — на аднаго чалавека ў кватэры павінна прыпадаць менш за 15м². Права на льготу таксама маюць муж і жонка, якія ўпершыню ўступілі ў шлюб, жыхары інтэрнатаў, сіроты і некаторыя іншыя катэгорыі грамадзян.

### Што можа перашкодзіць?

Каб стаць у чаргу ў сталіцы, трэба пражыць у Мінску 5 гадоў. Гэта не датычыцца размеркаваных маладых спецыялістаў.

**ЯМ**

# Жупранскія гавэнды

**Збіраем па каліву ў скарбонку беларускага гумару.**

Ашмяншчына — каталіцкая старонка. Спецыфічны для Беларусі рэгіён, дзе ўсё прасякнутае духам «лацінікаў». Тут пануе свая культура, свае арыгінальныя звычаі. Тут не калядуюць, а валачобнічаюць, вітаюцца «пахвалёнкай», з недаверам глядзяць на прыбышоў, а яшчэ любяць з фанабэрыяй хваліцца адно перад адным (ці не засталася гэта звычка па тых ваколіцах ад прашчураў-шляхцюкоў?)

З Ашмяншчыны паходзіла вялізарная колькасць беларускіх ксяндзоў-адраджэнцаў: Язэп Германовіч (Вінцук Адважны), Адам Станкевіч, Аляксандр Астрамовіч (Андрэй Зязюля), слынны Уладзіслаў Чарняўскі. Амаль кожны з іх быў творчай асобай, заслынуў калі не вершамі, то публіцыстыкай. Адсюль яны чэрпалі веру і паэтычны, летуценны погляд на свет. На жаль, моладзь на Ашмяншчыне ўсё больш робіцца «бээрсэмаўскай» і расійскамоўнай, але ад людзей сярэдняга пакалення яшчэ можна пачуць трапяткую, «салодкую» мову Багушэвіча.

На Ашмяншчыне ўсё адметнае, нават гумар, дзе рэлігійныя элементы моцна ўкараніліся, а слухач, каб «зразумець соль», павінен, прынамсі, крыху пазнаёміцца з «тутэйшай» культурай.

Прапаную Вашай увазе некалькі показак, пачутых мною ў Жупранах:

### Вярталася кабета

пешшу з мястэчковага фэсту дадому ў родную вёску. На паўдарозе схапіла яе пільная «патрэба». Балазе, кусты пры дарозе. Залезла яна ў кусты, зрабіла, што натура патрабавала, але як папраўлялася, то заправіла сабе за падол спадніцу ў майткі і не заўважыла. Выйшла на дарогу і ідзе, галаву высока трымае, сцёгнамі калыша, вядома, з фэсту вяртаецца. Даганяе яе сусед на ровары і войкае: «А-ёй, як жа гэта пані ідзе?» А кабеце не ў галаве, што той з яе смяецца, бо яна так важна ідзе, як пава, дык яна яму і адказвае: «А чаго пан хоча? Як ахвяравалася ў касцеле перад ксяндзом, так і іду!»

### Гадаваўся ўнук

у дзядоў-каталікоў. Пабываў у гасцях у іншых дзядоў-праваслаўных, а тыя звадзілі яго ў царкву. Бабулька-каталічка пытаецца ўнука вечарам, пасля вяртання яго з гасцей: «А што ж ты там, дзетка, бачыў у той царкве?» «Папа барадатага бачыў», — адказвае малы. «А што той поп казаў?» — не можа спатоліць цікавасць бабуля. «А ўсё, бабця, тваю карову Рабэ ўспамінаў, а пра нашу Маліну ні слова не сказаў».

### Прыйшла бабулька да ксяндза

на споведзь. Укленчыла перад спавядніцай і кажа: «У нядзелю да касцёла заўжды хадзіла, штодзённыя пацеры адгаворвала, мяса ў пёнтак не ела, адзін грэх толькі маю!» — «Які ж гэта грэх?» — пытаецца святар. — «Пра ксяндза па завугольлях і суседзях пляткавала», — адказвае бабулька. Ксёндз на тое кажа: «Лепей бы ты, бабулька, мяса ў пёнтак з'ела».

### Адна дзяўчына не ўмела чытаць

па-польску. Пачула ў касцёле словы ксяндза «Яко было на пачонтку», запомніла і вырашыла пахваліцца перад равеснікамі, што ўмее чытаць і гаварыць па-польску. Прыйшла ў касцёл, стала пасярэдзіне, адкрыла кантычку дагары нагамі і нібы чытае: «Яко была, яко была». А ззаду дзяцюк падлятае і кажа: «Раз ты кабыла, то хадзі павядзём цябе да цыганскага жарэбчыка».

**Віктар Шукеловіч, Жупраны-Люблін**

## На якой гэта мове?

**У апошнія гады вулічныя шыльды на Глыбоччыне пішуцца амаль выключна па-расійску.** Гэтым раён адрозніваецца нават ад усходняй Беларусі, дзе дагэтуль на дарожных знаках дамінуе мова тытульнай нацыі. Але праблема не толькі ў мове. Асабліва рэжуць вока непісьменныя шыльды. Напрыклад, шыльда «Палявачэ» на чыгуначнай станцыі Палівачы, «Глубокае» замест «Глыбокае» (ці хаця б «Глубокое») і інш.

А ў вёсцы Мосар, самай вялікай нашай турыстычнай атракцыі, паставілі шыльду, на якой грамацеі напісалі наступны перл — «Кастел Свенты Анны». Пытанне для лінгвістаў, на якой мове гэты надпіс?

**Андрусь Храпавіцкі, Westki.info**




## «Што ты зрабіў для Хіп-Хопу ў свае гады?»

**Вельмі добра, што падымаецца тэма прыкрых памылак у шыльдах населеных пунктаў.** Але ці спрабаваў аўтар зрабіць высілкі, каб выправіць надпіс? Ці будзе плён ад таго, што «Наша Ніва» напіша пра памылку? Ці адрэагуюць адказныя чыноўнікі?

Хачу распавесці пра падобны выпадак, але з станоўчым вынікам.

На скрыжаванні мінскіх вуліц Гарадзецкай і Шафарнянскай некалькі гадоў віселі шыльды з арфаграфічнай памылкай. На іх было напісана «вул.Гарадецкая», замест «вул. Гарадзецкая». Давялося накіраваць запыт на сайт Мінгарвыканкаму з указаннем на памылку і просьбай яе выправіць. У адказ прыйшоў ліст, падпісаны намеснікам начальніка КУП «Мінтранс» Тозікам В.А., у якім стаяла, што «ў найбліжэйшы час памылкі на інфармацыйных указальніках прыпыначнага пункту будуць выпраўленыя». Але прайшло два месяцы, а ўсё заставалася, як і было. Тады я звярнуўся лістом наўпрост да Тозіка В.А., удакладніўшы, што шыльды з памылкамі месцяцца не на ўказальніках прыпыначнага пункту, а на слупах з асвятляльнымі ліхтарамі. Адказ не змусіў доўга чакаць: КУП «Мінтранс» не вешае такія знакі маршрутнага арыентавання. За іх адказвае ДАІ, куды і быў перанакіраваны мой запыт. Як вынік — памылку выправілі.

Такім чынам, у Мінску выправіць памылкі ў беларускамоўных шыльдах можна вельмі лёгка, не адыходзячы ад любімага камп'ютэра. Дастаткова зрабіць допіс (можна нават ананімны) на сайце Мінскага гарадскога выканаўчага камітэту (http://www.minsk.gov.by/forum).

Поспехаў!

**МЗ, Мінск**







## Дзве групы беларускай дыяспары ў Эстоніі

**Цытуючы радок аднаго верша «Працавітыя і здольныя, беларусы ўсюды ёсць...», можна адзначыць, што ёсць яны і ў Эстоніі. І іх нямала.**

Этнічных беларусаў у Эстоніі па статыстыцы 17 тысяч чалавек. У Эстоніі існуе таксама і прыкладна 20 арганізацый беларускай дыяспары. Некаторыя з іх большыя, некаторыя меншыя, а некаторыя аб'ядноўваюць усяго некалькі чалавек.

Наогул, усю беларускую дыяспару ў Эстоніі цяпер нефармальна падзяляюць на дзве групы — гэта так званая «старая» і «новая» дыяспара. Для старой дыяспары Беларусь з'яўляецца раем на зямлі, краіна для пераймання ва ўсіх адносінах. Прадстаўнікі старой дыяспары ў Беларусі бываюць рэдка або былі вельмі даўно, інфармацыю чэрпаюць з расійскіх СМІ і спадарожнікавага «Беларусь ТБ». Інфармацыю аб тым, што ў Беларусі не ўсё так гладка, як здаецца, яны ўспрымаюць вельмі варожа. Ім прыемна жыць міфамі. У прынцыпе, як і шматлікім беларусам у Беларусі. Сярэдні век гэтых людзей 55—60 гадоў.

Іх нефармальным лідэрам з'яўляецца Ніна Савінава, лідэр талінскай старой дыяспары, якая мае добрыя ўзаемаадносіны з беларускім консульствам і прапагандуе існы ў Беларусі рэжым у Эстоніі. Тры разы ў месяц на эстонскім «Радыё-4» выходзіць гадзінная перадача «Бацьковщина» (арфаграфія назову захаваная), дзе яна разам са сваім сябрам, былым гомельскім палітыкам Артурам Цурбаковым, распавядае для старой беларускай дыяспары, як добра ў Беларусі, рэкламуючы беларускія санаторыі і абыходзячы праблемы і вострыя куты.

Новая дыяспара яднае беларусаў, якія ведаюць Беларусь не толькі як краіну вялікага народу і прыгожай прыроды, але і як краіну, у якой ёсць і праблемы. Лідэрам гэтай дыяспары я б назваў Юрыя Юркевіча, этнічнага беларуса, які нарадзіўся і вырас у Эстоніі, дасканала ведае гісторыю Беларусі і беларускую мову, працуе ў талінскай мэрыі, сябра Рады БНР. Для мяне гэта добры прыклад таго, што сапраўдны беларус можа быць беларусам, да таго ж пасляховым, у любой краіне.

Лідэрам новай дыяспары можна таксама назваць і Паўла Марозава, палітычнага ўцекача з Беларусі, высілкамі якога арганізоўваецца большасць беларускіх мерапрыемстваў у Эстоніі.

Трэба аддаць належнае ў плане захавання культуры Беларусі і тым, і іншым — усе беларусы ў той або іншай ступені пачуваюцца беларусамі, захоўваюць нашу культуру, і гэта галоўнае.

**Ігар Случак, Талін**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**


Рэспубліка Беларусь

ГАРОХ
Генадзій Іванавіч
прадпрымальнік

Рэспубліка Беларусь
220002 г. Мінск
вул. Варвашэні, [redacted]

тэл. сл. [redacted]
тэл/факс [redacted]
тэл. д. [redacted]

Крыху настальгіі. Добраслаўлёныя 1990-я: першыя беларускія візітоўкі.

**ЛК**

## ВОДГУКІ НА САЙЦЕ NN.BY

### «Помнік баламуту» (№21)

**Уладзімір**

Князь у веку 74-х гадоў загінуў з мячом у руках у бітве супраць татараў, а «ўдзячны» нашчадак па-плебейску называе яго «баламутам».

**Dardan**

Ды гэта і не помнік зусім, а нейкая нехлямяжая паркавая скульптура.

**Ales Jurkaviec**

«Чаму менавіта князю Андрэю пастаўлены помнік? Як альтэрнатыву варта б было разгледзець хаця б кандыдатуру другога Альгердавіча, Свідрыгайлы», — піша аўтар. А што, у Полацку ёсць нейкая квота на помнікі? Калі паставілі Андрэю Полацкаму, то нікому іншаму ўжо нельга? Можа, Свідрыгайлу таксама можна паставіць пасля, і спакойна гэтыя помнікі ў даволі вялікім горадзе ўжывуцца?

Увогуле, я толькі супраць таго, каб беларускія плошчы застаўляць помнікамі людзей, якія да Беларусі ці зусім не маюць аніякага дачынення, ці адыгралі ў яе гісторыі ролю выключна негатыўную. Усім астатнім — можа быць, абы ставілі. А паслядоўнасць тут не такая важная.

### «Ваўкавыская готыка» (№21)

Зачапіў матэрыял пра ваўкавыскую готыку. Мне вельмі свярбіць давядацца, у які час царква Аляксандра Неўскага, што ў Емяльянаве, была каталіцкаю капліцаю. Калі ласка, адкажыце, адкуль такія звесткі. І яшчэ: пісаць пра Ваўкавышчыну, пра Воўпу ў тым ліку, ды не ўзгадаць Ларысу Антонаўну Геніюш — стоўп беларускай святасці — гэта недаравальна. Іншыя ж імёны ўзгадвалі.

**Юра Ш.**

**Ад аўтара:** Вялікі дзякуй за ўвагу да майго тэксту. Царкву Аляксандра Неўскага, пра якую вядзецца ў тэксце, у літаратуры найчасцей адносяць да вёскі Кузьмічы. Так, першапачаткова яна будавалася як каталіцкая капліца, у неагатычным кшталце, паміж 1840 і 1850 гг., пра што піша аўтарытэтны даследчык Анатоль Кулагін у энцыклапедычным даведніку «Праваслаўныя храмы на Беларусі» (Мінск, 2001). І прыпісаная гэтая капліца была да касцёлу ў Вярэйках, таксама пазней пераробленага на праваслаўную царкву, але ў 1920-я вернутага каталікам. А капліцу ў Кузьмічах-Емяльянаве не вярнулі.

Пра Ларысу Геніюш напішу ў эсэ пра Зэльву.

**Сяргей Харэўскі**




**У Слоніме чатыры Леніны, а мусіў бы стаяць Маркс — але не Карл, а Міхаіл, заснавальнік сеткі крамаў «Marks & Spencer», што тут нарадзіўся.**

# Слонім і Жыровічы

Адзін з найцікавейшых маршрутаў выходных дзён.

Назва гораду паходзіць, вераемна, ад славянскага «услона» — засланіць, абараніць. Хоць некаторыя дасціпнікі выводзяць яе ад сланоў, што тут нібы вадзіліся. У кожным жарце ёсць каліва рацыі. Так, у ваколіцах Слоніма знаходзяць парэшткі дагістарычных сланоў. Але вось людзей тады тут не было...

Дабрацца да Слоніма можна і цягніком, праз Баранавічы. Заадно будзе нагода разгледзець слонімскі вакзал — помнік дойлідства міжваеннага часу ў духу неабарока. Калі ж ехаць у Слонім машынаю — гэта блізу 200 км на паўночны захад ад Мінску па Брэсцкай шашы.

Мала хто ведае, што Слонім быў калісьці сталіцай беларускіх земляў. Дакладней, цэнтрам найвялікшай беларускай губерні. Менавіта старажытны Слонім расійская імператрыца Кацярына II зрабіла ў 1795 г. цэнтрам вялізарнага абшару, у які ўваходзіла амаль уся заходняя Беларусь.

І сапраўды, нешта сталічнае адчуваецца тут, у горадзе над Шчараю. Ну, у якім яшчэ райцэнтры ёсць вуліцы Студэнцкая, Оперная? Тут збераглося нешта большае, чым проста дамы ці святыні. Ацалеў традыцыйны распарадак жыцця.

Прайсціся пагодным днём па слонімскіх мастах, падзівіцца хуткаплыннай Шчары — адна асалода. Галоўная частка старога гораду месціцца на высокім левым беразе ракі. Гарысты краявід, шчыльная старажытная забудова, купалы і званіцы надаюць Слоніму віленскі выгляд.

Ідучы па моцце вуліцаю Янкі Купалы, можна пацешыцца і старасвецкімі камянічкамі, і густымі садамі, і далінаю ракі, і паўмесяцам мінарэту, што ўзнёсся над Шчараю на вуліцы Кірава, былой Татарскай. Мусульмане жывуць тут спрадвеку. Колішні слонімскі джума-мячэт з трыма мінарэтамі быў спалены ў працэсе вызвалення Заходняй Беларусі. Ад ісламскае старасвеччыны ў Слоніме захаваўся старадаўні мізар — мусульманскія могілкі у прадмесці Лабзоўка, за гарадскімі агульнымі могілкамі. За зялёнай брамай з паўмесяцамі — старыя-старыя клады... Наогул, слонімскія могілкі — габрэйскія, каталіцкія, праваслаўныя, немецкія — цікавая частка тутэйшае спадчыны. Найстарэйшыя — Ружанскія, могілкі на Лабазоўцы і могілкі ў Альбярціне. Калі хопіць часу, агледзець іх варта. Бо часам старадаўнія могілкі, і тое, як іх і хто іх даглядае, могуць распавесці нам пра дзень сённяшні больш, чым якая газета...

## Горад чатырох Ленінаў

З моста над Шчараю відаць высачэзны купал толькі адбудаванага Спасаўскага сабору, што прысеў акурат на краі стромае гары. Гэты фундаваны яшчэ Сапегамі касцёл пасля паўстання 1863 г. перарабілі на праваслаўную царкву, а ў хрушчоўскія часы ўзарвалі. На тым пляцы паставілі помнік Леніну, што паказваў рукою на далёкія разлогі над Шчараю, на слонімскае Замосце. Але на мяжы тысячагоддзяў сабор аднавілі. І Ленін цяпер паказвае рукою акурат на яго. Маўляў, слушнай дарогай ідзяце, таварышы.

Дарэчы, Ленінаў у Слоніме чатыры. Самы стары, у натуральную велічыню, прысеў ля Шчары, у парку, дзе самотна бавіць вечары.

Ад старога-новага сабору цягнецца сімпатычны бульвар у бок плошчы Леніна, вуліца Першамайская, на якой таксама нямала помнікаў розных эпох, а таксама кавярняў.

Спыніцца тут можна ў гасцініцы «Шчара» — нятанна, ці ў санаторыі «Сонечны» — танней.

У свеце Слонім ведамы як радзіма Маркса. Міхаіл Маркс — адзін з сузаснавальнікаў кампаніі «Marks & Spencer», што валодае сеткаю супермаркетаў. Маркс вынайшаў ідэю крамы-складу. Першая крама-склад была адчыненая ім у Манчэстэры ў 1897 г. У Марксавай імперыі працуе 70 000 чалавек, яе абарот вымяраецца мільярдамі фунтаў. А гандляваць Маркс, пэўна, вучыўся на славутых слонімскіх кірмашах.

## Слонім Агінскага

У Слоніме засталося куды больш помнікаў дойлідства, чым у іншых нашых гарадах. Стаіць будынак магістрату. Пры кляштары бернардынак аднаўляюць раскошную манументальную браму. Сам касцёл таксама варты самае пільнае ўвагі, бо тут перахавалася аўтэнтычная барочная пластыка.

І ў тых касцёлах, у Траецкай царкве і нават у аблупленай і закінутай Вялікай сінагозе, засталіся старыя аздобы, ляпніна і роспісы часоў роскріту Слоніму!

А роскріт тут быў у сярэдзіне XVIII ст., калі ў Слоніме гаспадарыў вялікі гетман Міхал Казімір Агінскі, дзядзька славутага кампазітара. Пры Агінскім тут былі пабудаваныя прадпрыемствы па вытворчасці ядвабовых тканін, дываноў і габеленаў. Гэта ён арганізаваў будаўніцтва першага Балтыйска-Чарнаморскага калектару — каналу, што цяпер носіць яго імя. У горадзе Агінскі пабудаваў палац, школу, тэатр, друкарню, парк і конны манеж. Фінансаваў два оперныя калектывы і аркестр. Слонімская опера гастралявала ў Варшаве! Зрэшты, і цяпер тут ёсць уласны Слонімскі драматычны тэатр. Мо і універсітэт неўзабаве паўстане...

## Альбярцін

Як будзеце ў Слоніме, не абмініце Альбярцін. Гэта адно з найцікавейшых слонімскіх прадмесцяў, што нельга ўявіць без знакамітай папярні. Завод «Альбярцін» — адно з найстарэйшых адобных прадпрыемстваў Беларусі. Ад яе праз раку Ісу — сядзіба Пуслоўскіх з манументальнай брамай. Тут усё выдатна захавалася: можна ўявіць сабе, як жылі паны 150 гадоў таму. Палац, стайня, флігелі. А навокал — вялікі стары парк з маляўнічым штучным возерам. Тут пры жаданні можна і пакупацца.

У палацавай калекцыі калісь былі карціны Рубенса і Брэйгеля, нават эскізы да Вінчы. У часе першае сусветнае вайны скарбы былі вывезеныя ў Маскву. На гэтым іх сляды губляюцца.

У лесе побач захваўся легендарны валун, у які на вачах пана Пуслоўскага шугануў маланка, абмінуўшы панскі вазок. Камень раскалоты, сапраўды, напалам, нібы сякераю. Тутсама ў лесе, пры Белай крыніцы, ляжыць яшчэ адзін камень, з каваным крыжам... Месца гэтае лічыцца святым.

Альбярцін — гэта таксама месца адраджэння уніі ўш міжваенны час і пакутніцтва грэка-каталіцкага экзарха Антонія Неманцэвіча, расстралянага нацыстамі ў 1942 годзе.

## Жыровічы — праваслаўная святыня

Слонімскі староста Леў Сапега спрычыніўся і да стварэння манастыру ў недалёкіх адсюль Жыровічах. Гісторыя згадвае мястэчка Жыровічы ад 1470 г. Тады, паводле падання, у лесе, на дзікай грушы, пастухі ўгледзілі абраз Маці Божае. На тым месцы пан Солтан пабудаваў драўляны храм з манастыром і кляштар. Леў Сапега падараваў манастыру зямлю, на якой паўстала і мястэчка. А з будаўніцтвам мураванага Успенскага сабору Жыровічы сталі магутным цэнтрам грэкакаталіцкае царквы ў Рэчы Паспалітай. Першым архімандрытам тутэйшага базыльянскага манастыру быў сам Язафат Кунцэвіч.

Цудам, нягледзячы на войны, наезды Хмяльніцкага, немецкіх і савецкіх войскаў, Жыровічы і ўсе тутэйшыя храмы ацалелі... Нават драўляная Георгіеўская царква XVII стагоддзя на могілках. З-пад яе, з высокай гары, адкрываецца найлепшая панарама Жыровічаў.

Пабываць там і не пабачыць цудадзейны абраз, што захоўваецца ў манастыры, — марнаванне часу. Гэта маленькі каменны абразок, увабраны ў дарагія шаты. Тутсама бруіць крынічка, вада якой лічыцца святою.

Жыровіцкі манастыр — цэнтр праваслаўнага жыцця Беларусі. Тут вучацца на святароў. Тут моляцца манахі. Кідаецца ў вочы колькасць пілігрымаў. Яны рушаць сюды без розніцы ў веравызнанні... Для манашак з Жыровічаў у 2002 годзе ўтварылі жаночы праваслаўны манастыр у слонімскім прадмесці Лабазоўка. Пры гэтым манастыры ёсць і іканапісная школа для дзяўчат.

Завітайце і ў суседнія Старыя Дзявяткавічы. Тут зберагласяя драўляная Пятніцкая царква 1778 г., дзіўна спалучаная з з чатырма мураванымі калонамі. У тутэйшых ваколіцах яшчэ шмат чаго можна ўбачыць. Напрыклад, сціплы, але дагледжаны драўляны касцёлік на ўскрайку далёкае вёскі Сялявічы. У ім нейкім цудам удалося аднавіць колішняе хараство, урачысты алтар. Сённяшні храм Святой Барбары быў пабудаваны ў 1877 г., зачынены ў 1950 г., асвечаны наноў у 1989 г. Вось такія святыні, выпакутаваныя і вынесеныя з полымя гісторыі, кранаюць часам душу болей, чым вялізарныя каменныя спаруды. Сваёй шчырасцю і някідкай беларускай годнасцю. Як і ўвесь тамтэйшы край.



Жыровічы. Манастыр. Яго святыня — маленькі каменны абраз.





**Слонімцы лічаць свой горад радзімай сланоў.**

**Слонім**

горад у Гродзенскай вобл., на рацэ Шчара пры ўпадзенні ў яе р.Іса. Раённы цэнтр. 50,8 тыс. жыхароў (2008).

1102 — першая згадка ў летапісах (Услонім і Васлонім). У 1531 Жыгімонт Стары дараваў месту Магдэбургскае права. У 1655 разбураны маскоўскім войскам. З 1795 увайшоў у склад Расійскай імперыі, цэнтр Слонімскай губерні. У1886 праз Слонім прайшла чыгунка Баранавічы — Беласток.

**Слонімцы**

У Слоніме нарадзіўся Міхаіл Маркс — адзін з сузаснавальнікаў кампаніі «Marks & Spencer», што валодае сеткаю супермаркетаў. Гэта горад Агінскіх. З дзеячоў нацыянальнага руху ў Слоніме жылі Кандрат Лейка і Галляш Леўчык — аўтары «Нашай Нівы», святар і літаратар Адам Станкевіч, славуты пратэстанцкі дзеяч Лукаш Дзекуць–Малей — аўтар малітоўніка на беларускай мове. Хрысціяне тут маюць сваіх пакутнікаў — сёстраў–непакалянак Марту Валоўскую і Еву Наішэўскую, што былі ў 1942 г. расстраляныя на Петралевіцкай гары.

# Доўгія гады спадарыні Алёны

З сястрой арганізатара пасляваеннага антысавецкага мядзельска–смаргонскага падполля Расціслава Лапіцкага гутарыць **Наталка Бабіна**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Алёна Шарэпа-Лапіцкая з тых жанчын, якія ў любым узросце і ў любых жыццёвых абставінах выклікаюць захапленне сваёй сілай, жаноцкасцю, шляхетнасцю.

Ёй скора будзе 92 гады. Яна жыве сама ў мінскай кватэры. Няпроста ў такім веку. Увогуле, лёс не песціў яе: у 9 гадоў яна страціла слых, перахварэўшы на наймацнейшы атыт, цяпер амаль не бачыць... Але нас сустрэла не бездапаможная старая, а выкшталцоная кабета.

Спадарыня Шарэпа-Лапіцкая ўспамінала дзяцінства, бацькоў, братоў, родныя мясціны Вілейшчыны — і выразная карціна жыцця паўставала з яе словаў. Станавілася зразумелым, адкуль, з якіх выпрабаванняў вырастаюць у беларускім нацыянальным руху такія нязломныя асобы, як яе брат Расціслаў, як яна сама...

Яна нарадзілася ў Разані: сям'я мусіла выехаць у эвакуацыю падчас Першай сусветнай. Маці хацела назваць дачку Алёнай, але бацька запісаў яе як Вольгу — ён усіх сваіх дзяцей называў імёнамі Кіеўскіх князёў. Так і засталася дзяўчынка з двума імёнамі. Неўзабаве сям'я вярнулася на радзіму, у вёску Касута, што на Вілейшчыне.

У сям'і было пяцёра дзяцей: Вадзім, Вольга (Алена), Алег, Ігар, Расціслаў. Бацька, Аляксандр, быў дзяком, а маці, Настасся, займалася гаспадаркай. Толькі вось ладу, разумення, кахання не было ў сям'і...

«Браты — мой сум», — так гаворыць спадарыня Алёна. Яна паказвае даўні фотаздымак брата Ігара: на вышыванай падушцы прыгожы, бы анёлак, хлопчык гадоў шасці.

«Неяк летам бацька ўсіх нас, дзяцей, вывеў сцягваць лён. І Ігар таксама насіў снапы. Гэта ж цяжка шасцігадоваму, ды быў ён босы — і пракалоў асцём нагу. Я заліла рану ёдам, але бацька прымусіў Ігара зноў выйсці на поле. Рана загнаілася, пачалося запаленне. Маці думала, што ў Вільні лячыць будуць лепш, павезла хлопчыка туды. Але доктар не пабачыў, што пачалося запаленне крыві. І хлопчык памёр... Бацькава жорсткасць ды тупагаловасць доктара Яноўскага з Вільні загубілі яго...»

Неўзабаве пасля смерці Ігара нарадзіўся Расціслаў. Алена ўспамінае, як даглядала яго, як яны разам гулялі...

«Расціслаў быў вельмі справядлівы. Ён гаварыў пра камуністаў: «Я з імі не ўжывуся». Яны ўвялі невыносныя падаткі. Адзін чалавек у нас у сяле не мог сплаціць, то павесіўся... Ды мы самі куплялі масла на апошнія грошы ды здавалі як падатак...

Але я нічога не ведала пра групу, якую стварыў Расціслаў. Толькі нешта так мяне ў Кабыльнік цягнула, хоць бегма бяжы... А гэта ў той час Расціслаў там хаваўся перад арыштам, мусіць, пра мяне думаў. Я жыла сама ў Вілейцы, працавала па людзях, капала бульбу, той бульбай мне і плацілі. Калі несла мех, аплату сваю, падвярнула нагу, хадзіць не магла. Ну, думаю, цяпер мая думка мяне нікуды не пагоніць, бо хадзіць не магу. І тут прыязджае матка і кажа: «Прапаў наш Славік, арыштавалі яго!»

Расціслава Лапіцкага расстралялі ў 1950 г., а ў 2009 г. нехта, мусіць, з нашчадкаў тых, хто расстрэльваў, знішчыў помнік Расціславу, пастаўлены вілейскімі актывістамі на месцы расстрэлу, ва ўрочышчы Красны Беражок. Я доўга вагалася, ці паведамляць пра гэта ягонай сястры. Усё ж рашылася.

«Знішчылі... Аааа... Аааа... — інтанацыю гэтага тонкага, нейкага дзіцячага стогну мне перадаць складана. Але жанчына справілася з першымі эмоцыямі. — І пасля смерці пераследуюць. Там, у Красным Беражку, трэба пасеяць кветкі, валошкі і рамонкі... Хай будзе кветкавы помнік».

Спадарыня Алена ўмее трымаць удар — у гэтым, пэўна, і сакрэт яе доўгажыхарства... Наша размова перацякае на іншыя тэмы, гаспадыня расказвае, як год ад году ездзіла ў Ялту, парадкавала там магілу Багдановіча... Паказвае верш «Мухамор», які напісала праз год пасля смерці брата, пад мухамором маючы на ўвазе камуністычную ўладу:

...І лес гудзеў несамавіта,
Узнімаў пагрознай сілы скрып:
Нашто людской крывёй заліты
У нас такі разросся грыб?

...Адзінокую жанчыну, здавалася б, лёгка пакрыўдзіць. Але яна не дае сябе ў крыўду. Некалькі гадоў таму спадарыня Алёна перанесла інсульт. Ёй стала дрэнна, і яна папрасіла жанчыну, якая тады дапамагала ёй, выклікаць доктара. «Напішыце дарчую на кватэру, тады выклічу», — адказала тая. Спадарыня Алёна адмовілася, і «памочніца» ляснула дзвярыма. Суткі хворая прабыла без дапамогі...

Спадарыня Шарэпа-Лапіцкая марыць выдаць новую кнігу сваіх вершаў. Марыць надрукаваць успаміны пра брата. Пытаецца, куды перадаць рэліквіі, якія ў яе захоўваюцца: лісты Зоські Верас, фатаграфіі, верш і малюнак аўтарства Расціслава. Марыць зноў пабываць у Касуце, Кабыльніку, Красным Беражку... Я думаю, што яе мары мусяць збыцца.

Як мусіць нехта і адказаць за гэты тонкі стогн, што вырваўся ў яе — за расстрэл Расціслава і за апаганьванне помніку яму.



## Расціслаў Лапіцкі загінуў, змагаючыся за незалежнасць Беларусі

Расціслаў Лапіцкі нарадзіўся ў 1928 годзе. У 1944 годзе далучыўся да антысавецкага супраціву, цэнтр якога быў у Віленскай духоўнай семінарыі, дзе ў той час вучыўся ягоны брат Алег Лапіцкі. МГБ раскрыла гэтую арганізацыю, Алег Лапіцкі атрымаў тады 10 гадоў зняволення, а Расціслаў, як малалетні — тры гады. У 1945 годзе па амністыі юнак выйшаў на волю.

У мядзельскай, а потым у смаргонскай сярэдніх школах, дзе ён вучыўся у 1946—1949 гадах, Расціслаў аб'яднаў вакол сябе юнакоў і дзяўчат, якія не жадалі мірыцца з несправядлівасцю і нечалавечнасцю савецкага строю, у падпольныя групы. Асноўным спосабам дзейнасці быў распаўсюд антысавецкіх улётак.

У 1950 годзе група была раскрытая. Допыты, катаванні – і прысуд. Група ставіла сваёй задачай дабіцца незалежнасці Беларусі, што разглядалася савецкім рэжымам як асаблівае злачынства. Большасць атрымала па 25 гадоў лагераў, а кіраўнікі – Расціслаў Лапіцкі ды Факунда Несцяровіч – былі асуджаныя на расстрэл. Несцяровіч напісаў прашэнне аб памілаванні, і расстрэл яму замянілі зняволеннем, а Расціслаў пісаць такое прашэнне катэгарычна адмовіўся... Яго расстралялі ва ўрочышчы Красны Беражок ля Вілейкі. Было яму тады 22 гады...

Ягоная сястра Алёна перажыла брата на 70 гадоў.

**Больш пра Расціслава Лапіцкага ў кнізе:** Міхась Чарняўскі. Як пошуг маланкі. — Мінск: Тэхналогія, 2006


## Новы ARCHE

Полацкі нумар




Пытайцеся ў кнігарнях
і ў незалежных распаўсюднікаў




# Гатэльнае пытанне

**Дзе спыніцца ў Мінску, каб гэта запомнілася?**

Праз пяць гадоў Беларусь прыме чэмпіянат свету па хакеі. Арганізатары чакаюць, што нашу краіну наведае каля 50 000 гасцей. Тым часам наяўныя гатэлі сталіцы здольныя размясціць каля 5700 чалавек.

### Аптымізм Навумава і гатэльная рэчаіснасць

На думку кіраўніка Беларускай федэрацыі хакею Уладзіміра Навумава, на чэмпіянат толькі з Расіі прыедзе 25 тысяч чалавек і яшчэ столькі ж — з іншых краін. Акрамя таго, чакаецца прыезд каля тысячы бізнэсоўцаў з усяго свету — спонсараў Міжнароднай федэрацыі хакею.

Дзе такую масу народу размясціць на час турніру?

У двухмільённым Мінску каля трыццаці гатэляў, якія адначасова могуць змясціць 5 691 чалавека. Для параўнання: 128-тысячны Берн сустрэў гасцей сёлетняга чэмпіянату свету па хакеі 26 гатэлямі, а мільённы Цюрых, дзе размяшчалася другая арэна, мае 131 гатэль. Усяго сёлетні чэмпіянат у Швейцарыі наведала 300 тыс. замежнікаў.

### Ёсць за $65, а ёсць і за $364

Спонсараў МФХ, безумоўна, зацікавяць у Мінску дарагія гатэлі. Напрыклад, «Еўропа» — першы 5-зоркавы гатэль сталіцы. Яго пабудова абвяшчалася аднаўленнем разбуранага ў часе другой сусветнай вайны аднайменнага гатэлю. Але будаваць вырашылі чамусьці на месцы першага гарадскога тэатру, а сам ён у параўнанні з арыгіналам вырас у аб'ёме амаль на траціну. Гэта адзіны ў краіне гатэль атрыюмнага тыпу (на любым паверсе жыхары адразу з нумару трапляюць на ўнутраную адкрытую галерэю-балкон і з любой кропкі могуць бачыць хол). Пражыванне ў найдаражэйшых нумарах «Еўропы» абыдзецца ў $364.

Пяцізоркавы «Crowne Plaza Minsk» пазіцыянуе сябе як «першы гатэль міжнароднага ўзроўню ў Беларусі». Пражыванне там каштуе ад $310.

Чатырохзоркавы гатэль «Вікторыя» на праспекце Машэрава, які вядзе ў Драздны, сумешчаны з бізнэс-цэнтрам. Начлег там каштуе ад $170.

У 2004 г. быў рэканструяваны гатэль «Мінск», ён першым у сталіцы атрымаў статус 4-зоркавага.Рэстаран гатэлю, «Сёмае неба», знаходзіцца на сёмым паверсе і выходзіць вокнамі на плошчу Незалежнасці. У гатэлі 250 нумароў, самы танны абыдзецца кліенту ў $165 еўра.

З трохзоркавых гатэляў прыцягвае ўвагу сціплы, але ўпарадкаваны гатэль міжнароднага адукацыйнага цэнтру IBB. Начлег тут каштуе $65.

Трохзоркавы гатэль «Беларусь» пазбег запланаванага дэмантажу праз крызіс. Пераначаваць тут можна за $52. З вокнаў гатэльнага рэстарану «Panorama Lux» адкрываецца захапляльны від. Гатэль знаходзіцца на беразе Свіслачы над Траецкім прадмесцем.

Сярод «Спадарожнікаў», «Турыстаў», «Экспрэсаў» начлегі ў сталіцы прапануюць гатэлі кінастудыі «Беларусьфільм», МУС, спорт-клубу Мінабароны, МАЗу і МТЗ.

### Зорны час ранцье

Палепшыць гатэльнае пытанне магла б рэалізацыя амбітных планаў пабудовы ў сталіцы шэрагу гатэльных комплексаў. Але сусветны фінансавы крызіс адклаў да светлай будучыні праект будаўніцтва гатэлю «Кемпінскі» на Кастрычніцкай плошчы ды астудзіў імпэт расійскай «Ітэры», якая паспела растыражаваць свае планы наконт забудовы тэрыторыі аэрапорту «Мінск-1». Не выключана, што і іншыя праекты такога кшталту, акрамя хіба гатэльна-забаўляльнага комплексу ў «Чыжоўцы» побач з будучай арэнай, чакае той жа лёс.

Частку гасцей чэмпіянату могуць прыняць турбазы, дамы адпачынку пад Мінскам, а таксама прыватнікі, што здаюць жытло на суткі. Урэшце, можна заняцца (час дазваляе) арганізацыяй сеткі танных начлегаў на манер заходніх хостэлаў, што б цалкам задаволіла маладую аўдыторыю чэмпіянату.

Але пабудова новых гатэляў, як дарагіх, так і танных, мусіць мець пад сабой эканамічную мэтазгоднасць. А пакуль нашу сталіцу цягам году наведвае ўсяго 200 тыс. замежнікаў (для параўнання: Прага штогод прымае 8 млн. турыстаў), правядзенне чэмпіянату падаецца недастатковай для гатэльнага буму падставай. Застаецца спадзявацца, што прэзентацыя Беларусі ў 2014 г. зварухне існы стан рэчаў.

**Сямён Печанко**

**«Еўропа»** ***** (вул. Інтэрнацыянальная, 28). 67 нумароў самага рознага ўзроўню камфортнасці — ад аднамесных да прэзідэнцкіх апартаментаў. Цана размяшчэння з сняданкам ад $364. Рэстаран гатэлю змяшчае 135 чалавек.

**«Crowne Plaza Minsk»** ***** (вул. Кірава, 13). 115 нумароў — ад $310. У наяўнасці бізнэс–цэнтр, фітнэс–цэнтр з басейнам, начны клуб, два рэстараны і кавярня.

**«Вікторыя»** **** (пр. Пераможцаў, 59). Гатэль сумешчаны з бізнэс–цэнтрам. 169 нумароў, 4 з іх прызначаныя для кліентаў з абмежаванымі магчымасцямі. Цэны ад $170. Гатэльны рэстаран на 150 месцаў, вітамінны бар.

**«Мінск»** **** (пр. Незалежнасці, 11). 250 нумароў ад катэгорыі стандарт да VIP–нумароў. Кошты ад $165. Да паслуг кліентаў начны клуб, тры рэстараны. Побач — гандлёвы цэнтр «Сталіца».

**«Планета»** *** (пр. Пераможцаў, 31). Гатэльны комплекс змяшчае бізнэс–цэнтр, крамы, пошту, абменны пункт. 310 нумароў гатэлю здольныя размясціць 460 чалавек. Цэны ад $89.

**«Юбілейны»** *** (пр. Пераможцаў, 19). Нумары, іх тут 239, каштуюць ад $83.

**«Арбіта»** *** (пр. Пушкіна, 39). Гатэльны комплекс змяшчае 210 нумароў ад эканом–класа да люксаў. Цэны ад $81. Побач супермаркет, кінатэатр, лядовы палац і начны клуб.

**Гатэль IBB** *** (пр. Газета Праўды, 11). Начлег тут каштуе ад $65. У комплекс IBB уваходзяць таксама бізнэс–цэнтр і рэстаран.

**Гатэль «Беларусь»** *** (вул. Старажоўская, 15). У наяўнасці нумары па цане ад $52 за ноч. Свае паслугі прапануюць тры рэстараны.

**Гатэль «Спадарожнік»** *** (вул. Брылеўская,2). Самы танны нумар тут каштуе ад $40.

# Адпачынак за 500 даляраў

**Напярэдадні паравіны адпускоў мы адкажам на пытанне: «Дзе сёлета можна правесці адпачынак, заплаціўшы за яго максімум 500 даляраў?»**

### Вядома ж, дома

«У беларускім санаторыі з поўным, 4-разовым, харчаваннем і курсам працэдур за гэтыя грошы можна смела адпачываць 12 дзён. І яшчэ застанецца», — кажа эксперт газеты «Туризм и Отдых» Ірына Шпакоўская. Хопіць адпачыць у санаторыі і на 21 дзень: цэны на 3-тыднёвыя пуцёўкі каштуюць пачынаючы ад 720 тыс., але гэта эканом-варыянты, увогуле сярэдняя цана перавышае мільён з паловай, што крыху больш за 500$. Але! Найлепшыя санаторыі краіны зазвычай ужо зарэзерваваныя да пачатка восені.

Яшчэ танны варыянт у Беларусі — усюдыісныя базы адпачынку: 7 дзён з трохразавым харчаваннем будуць каштаваць ад 65 тыс. рублёў (вядома больш цана — большае камфорт).

Трэці айчынны эканом-варыянт — аграсядзібы. За асалоду пажыць у вясковай хаце, але як правіла з усімі гарадскімі выгодамі ўнутры, вы заплаціце 10—12 даляраў на чалавека на дзень (без харчавання).

### Украіна

Ва ўкраінскіх санаторыях (напрыклад у Трускаўцы) суткі каштуюць ад $20. Цікава, што ў расійскіх здраўніцах падобнага кшталту (напрыклад, у Кіславодску) цэны на парадак вышэйшыя. На Украіне харчаванне залежыць ад якасці нумару: простыя нумар — дыетычны стол, даражэйшы нумар — асобнае, з далікатэсамі, харчаванне. Яшчэ адзін украінскі плюсік: часта, калі ў сям'і двое дарослых, дзіцяці дазволяць адпачываць бясплатна.

На Чорным моры: эканом-варыянт адпачынку ў Адэсе можна знайсці месца ў гатэлі пачынаючы ад $8 за суткі (без харчавання).

### Турцыя

З $500 у краіну двух кантынентаў беларускаму турысту сёлета рабіць няма чаго. Курорты, нягледзячы на крызіс, істотна падаражэлі. Фразы кшталту «Турцыя ад $310» у рэкламных абвестках датычаць марш-кідкоў на 3—4 дні, не больш. Паўнавартасны адпачынак там будзе каштаваць сёлета ад 600 еўраў. Істотны плюс Турцыі — усё ўключана. Раз заплаціўшы за пуцёўку ў Мінску, у Турцыі вы на пражытак амаль нічога не выдаткуеце.

### Егіпет

Яшчэ адна прыязная, бязвізавая для беларускага турыста краіна. Тут $500 на доўгі адпачынак таксама не хопіць. Хіба можна злавіць шанец і за танна з'ехаць па «гарачай пуцёўцы» з Мінску, Кіева і Масквы. Трэба адно сядзець на чамаданах і, скануючы інтэрнэт і турыстычныя абвесткі ў газетах, чакаць нагоды. Але ці будзе гэты сезон «гарэць» (ці будзе сёлета шмат прапаноў з пуцёўкамі ў апошнюю хвіліну) — невядома.

У Егіпце турагенты не рэкамендуюць гнацца за танным жытлом і сяліцца ў гатэлях, ніжэйшых за трохзоркавыя. Егіпецкія гасцініцы не дацягваюць да еўрапейскіх: дзве зоркі ў Егіпце і Балгарыі — гэта два розныя ўзроўні.

### Еўропа

Сёлета аматараў недарагога пацешыць адпачынак у Румыніі. Туры туды ў пачатку сезону каштуюць усяго 150 еўра без візы, якая стане ў 5 даляраў. У разгар лета стандартны тур у Румынію будзе каштаваць 300 еўра. Істотны мінус: дарога. 28 гадзінаў на аўтобусе (а ў Румынію беларуская адпачывальнікі збольшага дабіраюцца наземным транспартам) не кожнаму пад сілу.

Балгарыя. Нельга сказаць, што Балгарыя самая танная, але цудоўны варыянт для сямейнага адпачынку з малымі дзецьмі. Базавы кошт двухтыднёвага паўпансіёну (уключаны толькі сняданкі): 250-300 еўра + віза коштам 60 еўра + патрэба абедаць і вячэраць за свой кошт. Дарагавата, але паколькі дзіця адпачывае бясплатна, дык маем жаданых $500 на чалавека.

Але гэта пачатак сезону, а вось у сярэдзіне за месца ў двухзоркавым гатэлі вы заплаціце ад 420 еўра. Плюсы: у Балгарыі недарагія рэстараны.

Літва. У Паланзе можна заарандаваць пакой з кухняй ад 32 еўра за суткі. Але не забываемся на візу ў 60 еўра.

Прыемная нам таксама краіна Чарнагорыя: у пачатак і канец сезону пуцёўка туды каштуе калі 270 еўра. Віза не трэба, але як едзеш аўтобусам, давядзецца прыдбаць транзітную візу за 70 еўра. Не шкадуйце — транзітны шэнген мае свае плюсы: можна на кароткі час наведаць прылеглыя Прагу, Вену і Будапешт.

**ЛК**

**Два правілы для аматараў таннага адпачынку**

1. Купляць білеты і рэзерваваць гатэлі трэба загадзя, у сакавіку–красавіку.
2. Ехаць у пачатку і ў канцы сезону, калі цэны значна ніжэйшыя.

# Ад Баравой да Барселоны



ТОП-10 самых гарачых фестываляў гэтага лета.

### Be2gether

**12—14 чэрвеня каля Нарвілішскага замку, непадалёк ад беларуска-літоўскай мяжы**, пройдзе фестываль be2gether-2009. Хэдлайнерамі сёлета будзе гурт з ЗША **Gogol Bordello**. Беларусь прадстаўляе **«Ляпіс Трубяцкой»**. Квіток на адзін дзень фэсту be2gether будзе каштаваць 80 літаў, а на ўсе дні — 130 літаў — гэта каля 130 тысяч беларускіх рублёў.

### Басовішча

Музычны фестываль «Басовішча-2009» сёлета юбілейны — пятнаццаты. Ён пройдзе **17 і 18 ліпеня непадалёк ад польскага Гарадку**. Звычайнага конкурсу маладых гуртоў не будзе. Затое пакажуць відэа з першых фэстаў, а на сцэне выступяць хэдлайнеры першых «басоў» — **«Уліс»**, **«Мроя»**, **«Бонда»**, **Neuro Dubel**. З маладзейшых зайграюць **«Рахіс»**, **«Зніч»**, **«Бан-Жвірба»**, **«IQ48»**.

### GLOBAL GATHERING Freedom Festival

Беларусь таксама можа пахваліцца фестывалямі такога кшталту. Вандроўны фэст электроннай музыкі GLOBAL GATHERING Freedom Festival адбудзецца **на аэрадроме «Баравая» 27 чэрвеня**. Чакаецца 12-гадзінны танцавальны марафон, шоу-праграма і тры сцэны ў выглядзе пенна-пляжных пляцовак. Галоўны сюрпрыз гэтага году: хэдлайнерам фестывалю будзе найлепшы ды-джэй па выніках International Dance Music Awards 2009 — **Tiesto**. Сёлета сусветнае турнэ GLOBAL GATHERING Freedom Festival уключае сем краінаў: **Польшчу (6 чэрвеня), Беларусь (27 чэрвеня), Турцыю (4 ліпеня), Украіну (11 ліпеня), Вялікабрытанію (24—25 ліпеня), Расію (1 жніўня) і Паўднёвую Карэю (18—19 верасня)**. За навінамі фестывалю ды тэрмінамі продажу квіткоў можна сачыць на www.global-gathering.com/by.

### BeFree

Рок-фэст BeFree з удзелам беларускіх і ўкраінскіх музыкаў пройдзе ў першай палове жніўня, хучэй за ўсё ў Чарнігаве. Пакуль што іншай інфармацыі арганізатары не даюць, але абяцаюць, што падрабязнасці фестывалю хутка з'явяцца на сайце festsvabody.org

### «Пустыя ўзгоркі»

Сёлета на альтэрнатыўным фэсце «Пустыя ўзгоркі» выступяць ажно пяць гуртоў з Беларусі, а сам фэст пройдзе ў пяць дзён на пяці сцэнах. Канцэрты пройдуць **з 10 па 14 чэрвеня ў 300 кіламетрах ад Масквы**, але дакладнае месца пакуль не называецца. **Ходзяць чуткі, што ён будзе ля Смаленску.** Сёлета ў праграме выступы такіх гуртоў, як **«Наеховичи», «Умка и Броневичок», Jah Division**. Беларусія гурты — **«Адыс Абэба», «Маланка Orchestra», «ПУКСТ-Бэнд», CherryVata і The Worm Ouroboros**.

**З Мінску аўтобус на фестываль паедзе з Дружнай 11 чэрвеня раніцай, а назад у Мінск прыедзе 14 чэрвеня ўвечары.** Кошт туру — 80 у.а. Замовіць квіткі на тур можна праз тэлефоны: (029) 278-32-16, (029) 121-25-24.

### Sonar

Sonar — легендарны летні фэст электроннай музыкі. Трапіць на яго імкнуцца ўсе прагрэсіўныя выканаўцы і прыхільнікі актуальнай электроннай поп-музыкі. Строга кажучы, Sonar — гэта не музычны фэст, а форум сучаснага мастацтва. Акрамя канцэртаў і дыскатэк, тут адбываюцца кіна- і відэа-паказы і шмат чаго іншага з прыстаўкай арт. Фэст падзелены на дзве часткі Sonar by Day — дзённыя канцэрты, па большай частцы мала каму вядомых гуртоў, і Sonar by Night — начныя рэйвы з удзелам самых знакамітых дыджэяў. Сёлета на фестывалі будуць ды-джэй **Deadmau5**, легендарны гурт 1980-х **Grace Jones**, электронная група **Orbital** са сваімі хітамі ў суправаджэнні відэашоу. Sonar адбудзецца **з 18 па 20 чэрвеня ў Барселоне**, і большая частка квіткоў ужо прададзеная. І таму не адкладвайце ў доўгую скрыню: http://2009.sonar.es

### Джазавы фестываль Паўночнага мора

Ці ведалі вы, што Джазавы фестываль Паўночнага мора — адзін з самых вялікіх у свеце? Мерапрыемства аб'ядноўвае выканаўцаў і традыцыйнага новаарлеанскага, і авангарднага, і электроннага джазу. А таксама блюзу, соулу, R&B, хіп-хопу.

У праграме гэтага году будуць унікальныя і нечаканыя выступы. Можна будзе пачуць супольны праект джазавай легенды **Herbie Hancock** і класічнага піяніста **Lang Lang**. А таксама асобная ўвага праектам **«Blue Note»** і **«Jazz from Japan»**. Карацей кажучы, гэта трэба пачуць! Фестываль будзе праходзіць **ад 10 да 12 чэрвеня ў Ратэрдаме**. Больш падрабязная інфармацыя на сайце http://www.northseajazz.com

### Міжнародны фестываль «АртПоле. Звуки/дії в просторі» 2009 (Украіна).

На змену вядомаму фестывалю «Шешори Подільські» прыйшоў «АртПоле. Звуки/дії в просторі».

У гэтым годзе фестываль этнады фолкмузыкі будзе праходзіць цэлы тыдзень **у сяле Вараб'ёўка Няміраўскага раёну Вінніцкай вобласці**. Акрамя канцэртаў ды выставаў, можна будзе наведаць розныя культурніцкія студыі, а таксама паўдзельнічаць у арт-праектах. **12-16 ліпеня** там будуць дзейнічаць намётавае мястэчка і творчая лабараторыя пад адкрытым небам: студыі, малая музычная і тэатральная сцэны.

Для шырокага наведвання прадугледжаныя апошнія два дні фестывалю — **17 і 18 ліпеня**, калі на вялікай сцэне зайграюць музыканты з розных краінаў свету, а таксама будуць прадстаўленыя праекты, створаныя за папярэднія пяць дзён. Асноўная тэма «АртПоля'2009» — гэта узаемадзеянне мастака з навакольным асяроддзем, натхнёная дабудоўка свету тымі, хто ўсвядоміў сябе ў той жа час і часціцамі нашага агульнага сусвету, і непаўторнымі аўтарамі.

Калі вы збіраецеся ўдзельнічаць у фестывалі ўсе сем дзён, гэта будзе каштаваць 100 грыўняў (каля 36 000 рублёў). У іншым выпадку — 15 грыўняў за адзін дзень. Месца правядзення фестывалю і падрабязнасці праграмы можна пагледзець на http://www.artpole.org

### «Хай будзе ноч!» — Культурная ноч

Свята культуры, мастацтва, музеяў ды музыкі пройдзе ў самую светлую ноч году **ў Вільні. 20—21 чэрвеня з 18.00 да 6.00** у горадзе вашай увазе будуць прадстаўленыя кінафільмы пад адкрытым небам, канцэрты ў касцёлах, выставы ў музеях і галерэях, дэманстрацыя мод, лазерныя шоу, вечары паэзіі і іншыя мастацкія акцыі, у якіх пераплятаюцца мясцовыя ды еўрапейскія традыцыі. Мерапрыемства будзе праходзіць у рамках праекту «Вільнюс — культурная сталіца Еўропы 2009». Дадатковую інфармацыю шукайце на афіцыйным сайце праекту www.vilnius2009.lt

### Sziget

Штогод у Вугоршчыне праходзіць адзін з найбуйнейшых музычных фестываляў свету — Sziget. Ён ладзіцца **на выспе Obudai на поўнач ад Будапешту**. Цэлы тыдзень на 60 пляцоўках граюць вядомыя і маладыя музыкі з усяго свету ў розных музычных кірунках — ад металу і панку да блюзу і класікі. Сёлета Sziget пройдзе **12—17 жніўня**. Склад удзельнікаў Sziget 2009 пакуль дакладна невядомы, але на сайце sziget2009.com пачалі анансаваць выступы некаторых гуртоў. Сярод іх знакамітыя амерыканскія панкі **Rise Against**.

**Настасся Шамрэй**

## КАНЦЭРТЫ

### Вечар сучаснай харэаграфіі ад D.O.Z.SK.I

Тэатр сучаснай харэаграфіі «D.O.Z.SK.I» прадстаўляе вечар сучаснай харэаграфіі. У праграме: «Зіма», «Дуэт», «Сталасць», «У даліне долі», «Дэ-Рэ». Вечар пройдзе **на сцэне Рэспубліканскага тэатру беларускай драматургіі (вул.Крапоткіна, 44). Пачатак у 19:00.**

### Neuro Dubel: апошні канцэрт сезону

Вялікі летні канцэрт гурту Neuro Dubel пройдзе **18 чэрвеня ў Rockhouse Cafe (вул.Няміга, 12). Пачатак у 20.00.** Даведкі праз т.: (029) 254-49-09, (029) 671-58-65.

## ІМПРЭЗЫ

### Прэзентацыя пуцяводніку па гродзенскім Новым Свеце

Прэзентацыя кнігі гісторыкаў Андрэя Чарнякевіча і Ігара Трусава «Новы Свет і яго ваколіцы», прысвечанай гістарычнаму раёну Гродна, Новаму Свету, адбудзецца **11 чэрвеня ў 18.30 у памяшканні Таварыства беларускай мовы (вул.Будзённага, 48а)**.

### «Канец словаў»

Прэс-канферэнцыя з нагоды выхаду «вечнага» календара «Канец словаў» адбудзецца **16 чэрвеня ў 14.00 у кавярні «GRIP» (вул. Камсамольская, 19)**. У тым календары змешчаныя дванаццаць фотаздымкаў голых дзеячаў культуры, сярод іх Валянцін Акудовіч, Андрэй Хадановіч, Віктар Шалкевіч, Лявон Вольскі, Віталь Рыжкоў.

## ВЫСТАВЫ

### «Назіжэнне»

**Ад 20 мая да 20 чэрвеня кожны дзень, акрамя панядзелка, з 10:00 да 17:00 у Музеі Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а)** працуе выстава фатаграфій Сяргея Борсука «Набліжэнне».

### «Жывапісны коктэйль»

Да канца чэрвеня **ў мастацкай галерэі «ЛаСандр-арт» (вул. Раманаўская Слабада, 24)** працуе выстава твораў сучасных беларускіх мастакоў.

### Выстава дзіцячых малюнкаў

**11 чэрвеня ў 11.00 у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі (вул.Маркса, 12)** адбудзецца ўрачыстае адкрыццё выставы дзіцячых малюнкаў «Свет, у якім няма чужых». Выстава праходзіць у межах Міжнароднага дня бежанцаў, які адзначаецца 20 чэрвеня.

## ТЭАТРЫ

### 10 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Севастопальскі вальс»
**Лялечны тэатр** — «Прыгоды алавяннага жаўнерыка, пастушкі і камінара»
**ДК Прафсаюзаў** — «Гарбата з вярблюдам»
**Тэатр імя Горкага** — «Несапраўдны хворы»
**Тэатр юнага гледача** — «Падарожжа ў краіну сноў»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Старамодная камедыя»

### 11 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Лялечны тэатр** — «Марозка»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Старамодная камедыя»

### 12 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Ночы Венецыі»
**Лялечны тэатр** — «Пінокіо»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»

### 13 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Музычны тэатр** — Шапэніяна. Сучасны харэаграфічны дывертысмент.
**Лялечны тэатр** — «Пэпі Доўгая-панчоха»
**Тэатр імя Горкага** — «Нінучка»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

### 14 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Айбаліт-2002»

**Музычны тэатр** — «Магія кахання»
**Лялечны тэатр** — «Майдадыр»
**Тэатр оперы і балету** — «Марная асцярога»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»
**Тэатр юнага гледача** — «Мятлёк»

### 15 чэрвеня

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»

### 16 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Тэатр оперы і балету** — «Марная асцярога»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам!»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Адчыніце кантралёру!»

### 17 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Шклянка вады»
**Тэатр оперы і балету** — «Жызэль»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Апошняя жанчына сеньёра Хуана»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Тэрмінатар

**Тэрмінатар 4: хай прыйдзе збаўца** (Terminator Salvation)
ЗША — Вялікабрытанія — Нямеччына, 2009, каляровы, 115 хв.
**Рэжысёр:** Джозэф Макгінці Нікал
**Ролі выконваюць:** Крысціян Бэйл, Сэм Ворцінгтан, Антон Ельчын, Мун Бладгуд, Хелена Бонэм-Картэр, Арнольд Шварцнэгер
**Жанр:** фантастычны постапакаліптычны баявік
**Адзнака:** 6 (з 10)

У працягу слынных карцін нялёгкі лёс. Каб задаволіць гледачоў, трэба паўтараць вядомыя вобразы і адначасова прывабліваць навінай.

Трэці тэрмінатар пасля геройчных двух выглядаў ледзьве не самапародыяй. Чацвёрты мусіў прапанаваць цалкам новую сюжэтную лінію, тым болей, што найлепшы робат усіх часоў і народаў Арнольд Шварцнэгер сёння тэрміне не кіно, а каліфарнійцам на пасадзе губернатара. (Але гэта не перашкодзіла яму з'явіцца ў доўгачаканым эпізодзе (рубон!), шчодра насычаным кампутарнай апрацоўкаю).

Складаную задачу чацвёрты тэрмінатар, як мог, выканаў. Ёсць постапакаліптычная будучыня з выпаленай зямлёй, канцлагерамі для людзей і робатамі-ахоўнікамі. Ёсць вусціцшныя машыны, што дзіўна трансфармуюцца.

І ёсць новы герой, які ахвяруе сабой. І няважна, што сюжэтныя лініі не заўжды звязваюцца, што новы фільм нагадвае іншую кінафантастыку («Тэрмінатары» самі ж не спарадзілі!). Місія яшчэ не завершаная. У добры шлях!

**Андрэй Расінскі**

# Добрая кампанія для Вашых дзетак


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ідзе набор у дзіцячыя садкі з беларускай мовай.

На гэтае лета аж сем садкоў у Мінску маюць беларускамоўныя групы. Пішам «аж», бо ніколі раней у апошняе дзесяцігоддзе столькі іх не было. Перавага гэтых садкоў — інтэлігентны падбор дзяцей, часам — невялікія групы. Вашы малыя будуць вучыцца разам з дзецьмі з добрых сем’яў — дзеячаў культуры, бізнэсоўцаў, дактароў, навукоўцаў. Менавіта гэтае асяроддзе выбірае для сваіх дзяцей беларускамоўныя садкі і школы ў сталіцы. Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

### Мінск

**Дзіцячая дашкольная ўстанова №412 (пр.Газеты Праўда, 64а)** запрашае ў старэйшую ўзроставую групу з беларускай мовай выхавання. Даведкі праз т.: (017) 271-68-47.

**ДДУ №522 (вул.Русіянава, 23)** сёлета набірае малодшую групу. Даведкі праз т.: (017) 260-65-01.

**ДДУ №314 (вул.Багдановіча, 68а)** мае рознаўзроставую групу, тут прымаюцца дзеткі сярэдняга і старэйшага ўзросту. Даведкі праз т.: (017) 234-25-61.

**ДДУ № 534 (вул.Матусевіча, 59)** — цалкам беларускамоўны садок. Даведкі праз т.: (017) 257-76-91.

**ДДУ № 187 (вул.Кахоўская, 64а)** — цалкам беларускамоўны садок. Даведкі праз т.: (017) 213-06-71.

**ДДУ № 234 (вул.Карастаянавай, 19)** набірае рознаўзроставую групу. Даведкі праз т.: (017) 288-50-75.

Мінчукам з Сухарава, якія жадаюць з восені 2009 г. аддаць сваіх дзяцей 3—4 гадоў у беларускамоўны садок па месцы жыхарства, можна звяртацца праз тэлефон: (29) 395-73-99 (Дар’я) або праз e-mail: apalonik@gmail.com.

### Брэст

Таксама арганізуецца беларускамоўная рознаўзроставая група ў брэсцкім дзіцячым садку. Каб яна пачала працаваць ў верасні 2010, тэлефануйце +(029) 228-44-68 (Мілана) або лістуйце milka-kotka@tut.by ці milka-kotka@mail.ru. Заявы трэба падаць у верасні 2009, каб у супрацоўнікаў аддзелу адукацыі быў час падрыхтавацца (у тым ліку і маральна)).

### Гродна

Усе, хто жадае аддаць дзіця ў беларускамоўную групу, звяртайцеся па інфармацыю: тэл. (029) 868-98-82 (Ігар Кузьмініч).

### Магілёў

**ДДУ № 81** (Дняпроўскі бульвар, 58а (м-н Юбілейны)) — набірае рознаўзроставую групу (4-5 гадоў). Даведкі праз т.: (0222) 23-06-96.

### Маладзечна

Тут таксама будзе беларускамоўная група. Запрашаем далучацца і дапамагаць: тэлефон у Маладзечне (01773) 5-44-28; (029) 575-16-52 (Святлана).

Калі ў іншых гарадах Беларусі арганізуецца група з беларускамоўным выхаваннем, просьба звяртацца ў Рэдакцыю — мы з радасцю паведамім пра Вашую ініцыятыву нашым чытачам, якія маюць такую ж патрэбу.

**Сямён Печанко**

«БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 15—21 ЧЭРВЕНЯ

## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 15 чэрвеня, панядзелак

**18.00** Аб’ектыў–агляд (навіны)
**18.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 5 серыя
**18.50** «Закаханыя ў Мінску», дак фільм, рэж. Ульф фон Мэхаў, 2003 г., Нямеччына
*Нямецкую габрэйку высылаюць у працоўны лагер у Мінск. Там у яе закахаецца капітан Люфтвафэ і збяжыць з ёй і яшчэ 15 іншымі вязнямі да партызанаў.*
**20.20** Прэс–экспрэс (агляд медыяў)
**20.40** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 1 серыя: «Валютная палітыка»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Пляёны» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** «Дэраў», біяграфічная драма, рэж. Джон Дэйвід Коўлз, 1991 г., ЗША.
**23.10** «Навала», дак. фільм, 2007 г. Беларусь
**23.40** Аб’ектыў (навіны)

### 16 чэрвеня, аўторак

**18.00** Аб’ектыў–агляд (навіны)
**18.05** «З Новым годам!», маст. фільм, рэж. Клод Лелюш, 1973 г., Францыя.
*Дэтэктыўная камедыя з пэўнаю доляй аўтапародыі. Дуэт злодзеяў плануе «псіхалагічны рабунак», які пераплятаецца з «гісторыяй кахання». Рабунак быццам бы канчаецца няўдала, але – як паглядзець! Каханне таксама быццам бы, хаця зноў жа... Французы... Калі красці «з душою», дык чаму ж і не? Калі чакаеш каханага з вязніцы, чаму б не «пакуляцца» з іншым, пакуль каханы парыцца на нарах...*
**19.55** Хто ёсць кім: «Думай пра добрае» (Ганна Хітрык)
**20.15** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Усяслаў Чарадзей» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці піраміды», дак. фільм, рэж. Анна Венцкоўска, 2007 г., Польшча
**22.00** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 11 серыя
**22.55** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**23.20** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**23.40** Аб’ектыў (навіны)

### 17 чэрвеня, серада

**18.00** Аб’ектыў–агляд (навіны)
**18.05** «Ранча», серыял: 32 серыя
**18.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 11 серыя
**19.40** «Пень, поўны волава», дак. фільм, рэж. Бранка Шміт, 2007 г., Харватыя
**20.10** Без рэтушы: «Вацлаў Іваноўскі», 2009 г., Польшча
*Вацлаў Іваноўскі ўваходзіў ва ўрад БНР, быў кіраўніком Мінскага беларускага педагагічнага інстытуту. Падчас ІІ сусветнай вайны імкнуўся зрабіць усё, каб мінімізаваць ваенныя страты для беларускага народу. Застрэлены падасланым агентам у снежні 1943 г. Пахаваны на Кальварыйскіх могілках у Мінску.*
**20.30** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** «З Новым годам!», маст. фільм, рэж. Клод Лелюш, 1973 г., Францыя.
**23.20** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.40** Аб’ектыў (навіны)

### 18 чэрвеня, чацвер

**18.00** Аб’ектыў–агляд (навіны)
**18.05** «Ранча», серыял: 33 серыя
**18.50** «Апошні сезон», серыял: 7 серыя
**19.45** «89 міліметраў ад Еўропы», рэпартаж, рэж. Марцэль Лазіньскі, 1993 г., Польшча
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.15** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Усяслаў Чарадзей» (спазнаваўчая праграма)
**21.30** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыя ў эфіры», дак. фільм, рэж. Ізабэль Блёхль, Томас Штэлер, 2005 г., Нямеччына
**22.30** МакраФон: «Сон–трава», канцэрт гурта «Троіца»
**23.05** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 1 серыя: «Валютная палітыка»
**23.25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**23.40** Аб’ектыў (навіны)

### 19 чэрвеня, пятніца

**18.00** Аб’ектыў–агляд (навіны)
**18.05** «Ранча», серыял: 34 серыя
**18.55** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.25** Форум (ток–шоу): Куды пайсці вучыцца?
**20.10** Без рэтушы: «Вацлаў Іваноўскі», 2009 г., Польшча
**20.40** Госць «Белсату»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** «Тата», маст. фільм, рэж. Мацей Лесіцкі, 1995 г., Польшча
**23.10** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**23.40** Аб’ектыў (навіны)

### 20 чэрвеня, субота

**18.00** Аб’ектыў–агляд (навіны)
**18.05** «Паветраная абарона падчас «халоднай войны», дак. фільм, рэж. Джон Гёц, 2007 г., Нямеччына
*У другой палове 1940–х чалавецтва апынулася перад пагрозаю новае, ІІІ сусветнае вайны. Стан напругі паміж ліберальным Захадам і сацыялістычным Усходам, што працягваўся больш за чатыры дзесяцігоддзі, атрымаў у гісторыі назву «халодная вайна». Аўтарам стужкі ўдалося пераасэнсаваць вядомыя факты і знайсці новыя.*
**18.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**19.35** «Паром», дак. фільм, рэж. Зоя Катовіч, 2007 г., Беларусь
**19.50** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Звычайны прэзідэнт», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 1997 г., Беларусь
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Пляёны» (спазнаваўчая праграма)
**21.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.50** Чалавек–эпоха: «Маргарэт Тэтчэр — дзяцінства правадыркі», дак. фільм, рэж. Каміль Лё Памэлек, 2008 г., Францыя
*Маргарэт Тэтчэр была прэм’ер–міністрам Вялікабрытаніі рэкордна доўгі для XX ст. тэрмін. Аўтары фільму паказваюць шлях «жалезнай лэдзі» да ўлады.*
**22.45** «Апошні сезон», серыял: 8 серыя
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**23.50** Аб’ектыў (навіны)




### 21 чэрвеня, нядзеля

**18.00** Прэс–экспрэс (агляд медыяў)
**18.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 6 серыя
**19.00** Канцэрт гурта «N.R.M.», ч. 1
**19.55** Форум (ток–шоу): Каб людзьмі звацца
**20.40** Хто ёсць кім: Генадзь Бураўкін
**21.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
*Ён, далучыўшы да Навагрудку шэраг земляў, стаў першым князем Вялікага княства Літоўскага.*
**21.30** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**22.05** Фільматэка майстроў: «Застава», маст. фільм, рэж. Райка Грліч, 2006 г., Вялікабрытанія—Сербія і Чарнагорыя—Боснія і Герцагавіна—Македонія—Славенія—Харватыя.
*Падзеі фільму адбываюцца ў 1980–х на памежнай заставе пры югаслаўска–албанскай мяжы.*
**23.40** Аб’ектыў (вынікі тыдня)



## Азаранка знялася для мужчынскага часопісу

**Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка (№9 рэйтынгу WTA) знялася для травеньскага нумару французскага FHM. Публікацыя ўключае інтэрв'ю, а таксама здымкі ў бікіні. Апроч Вікі ў гэтым нумары засвяціліся і іншыя майстры ракеткі — славачка Дамініка Цыбулкава, украінка Алёна Бандарэнка і расіянка Анна Чэкветадзэ. Азаранка прызналася, што падчас фотасесіі адчувала сябе не зусім ёмка.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Ферма

**Крамлёўскі чыноўнік адмаўляе айчынным ёгуртам і кілбасам ў доступе на расійскі рынак. А што, калі перацягнуць на наш бок жывёльны свет Расіі? Фельетон Лёліка Ушкіна.**

— Цсссс, — прыклаў палец да вуснаў камандзір элітнага атраду. Спецназаўцы замерлі ля дзвярэй явачнай кватэры. Як перад кожнай адказнай аперацыяй, камандзіру згадаліся падзеі апошніх дзён.

Запарка пачалася, калі ў прыёмную ФСБ N-скай вобласці Расійскай Федэрацыі прыбегла даярка і працягнула паперку: яе чыталі каровы на ферме.

«Траваядны славянін! Уставай на бой за Саюзную дзяржаву! Дамагайся вяртання на наш рынак беларускіх прадуктаў. Адмаўляйся несці яйкі, даваць малако, не нагульвай тлушч, не цягай вазы! Толькі акцыямі простага дзеяння можна спыніць дзвюхногіх антыславянскіх пачвар...»

Пад тэкстам стаяў подпіс: «Абласны камітэт патрыятычных жывёл імя Савушкіна прадукту».

Гэта быў стопудовы сабатаж. У жывёлагадоўчым сектары вобласці, відавочна, дзейнічала агентура беларускіх вытворцаў малака і мяса.

Улётку аддалі ў экспертны аддзел. Экспертам спатрэбіліся суткі, каб зрабіць заключэнне: паколькі почырк аўтара ўлёткі быў такі, быццам пісала курыца лапай, значыць яе пісала курыца. Уначы чэкісты таемна паставілі жучкі ў бліжэйшым курніку. Экспертам спатрэбіліся суткі, каб вывучыць курыную мову. Яшчэ тры дні іх вушы апухалі ад размоваў пра сродкі пахудання для бройлераў і новыя амерыканскія моды «ножак Буша». Урэшце, удалося пачуць фрагмент цікавай размовы:

— Ко-ко-ко. Сёння дзікія качкі скінулі радыёграму. Аперацыя стартуе. Сёння ўначы сходка.

— Ку-ка-ры-ку! Нарэшце. Даўно пара ўрэзаць Крамлю. Няхай ведаюць, як тармазіць працэс інтэграцыі! Ідзі, але будзь асцярожны...

Цікаючыся следам за анімалам-здраднікам, спецназаўцы дайшлі да ўваходу ў явачны катух. Камандзір групы паказаў калегам фігу. Гэта значыла, што трэба рыхтавацца да штурму. Прафесіяналы па барацьбе з тэрарыстамі ціха знялі аўтаматы з засцерагальнікаў. З-за дзвярэй тым часам чуліся інструкцыі:

— ...цяпер ты, парася. Хутка прыязджае кіраўнік ураду. Напярэдадні ўся ферма мае заразіцца свіным грыпам. Вось у гэтых прабірках смяротны мікроб. Ха-ха-ха!

Спецназ пайшоў на штурм.

— Ляжаць, казлы! Ой...

Самыя сапраўдныя казлы, свінні, бройлеры, бараны, куры-цацаркі дружна кінулася на падлогу. Аднак спецназ рана трыумфаваў. У наступны момант чароўная сіла, што сыходзіла ад нейкага метафізічнага звера, прыціснула ваякаў да сцяны. Апошнім, што пачулі спецназаўцы перад адключкай, былі дзіўныя словы:

Этыс! Атыс! Аніматыс!
Чароўны трусік!

## ЖАРТЫ

* * *

На ўскрайку Барысава здзейснены напад на міліцыянера. Следства высвятляе, як міліцыянер апынуўся на ўскрайку Барысава.

* * *

Дагэтуль усе праграмы па барацьбе з крызісам больш нагадваюць спробу схавацца ад яго пад медным тазікам.

* * *

— Кім Ір Сен нарадзіў Кім Чэн Іра, Кім Чэн Ір нарадзіў Кім Чэн Уна і братоў яго...

— Што, навіны чытаеш?

— Не, выданне Бібліі, адаптаванае для Паўночнай Карэі.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Думе і каля Думы.** Дэпутат Мілюкоў даводзіў, што вялікая шкода выходзіць з таго, што кожнага праваслаўнага лічаць ужо і рускім. Ад гэтага і Расія не можа абнавіцца.

**«Наша Ніва». №22. 1909**

## IN MEMORIAM

### Памёр філосаф Уладзімір Фурс, надзея ЕГУ

У сваім доме ў Калодзішчах раптоўна памёр доктар філасофіі Уладзімір Фурс.

Доўгі час ён загадваў кафедрай філасофіі, магістарскай праграмай «Сацыяльная тэорыя і палітычная філасофія» Еўрапейскага гуманітарнага універсітэту (ЕГУ). Апошнім часам быў кіраўніком даследчага Дэпартаменту ЕГУ. Быў ён надзеяй ЕГУ, адным з вядучых выкладчыкаў. Многія меркавалі, што ён стане пераемнікам акадэміка Міхайлава на пасадзе рэктара універсітэту.

Філасофія была ягоным жыццём. Было яму 45 гадоў.

**nn.by**



**Фота 2 чэрвеня, за два дні да адыходу. Вільня. Уладзімір Фурс побач з рэктарам Міхайлавым на канферэнцыі «Сістэма вышэйшай адукацыі ў Беларусі і роля ЕГУ ў працэсе яе развіцця».**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Шчыра віншуем шаноўнага Алеся Галіча** з юбілеем. Шчасця, здароўя, добрай працы і каб ваш цудоўны голас гучаў і радаваў яшчэ доўга вас і нас. Сябры спеўнага гурту «Сядзіба»

### ЖЫТЛО

**Здам двухпакаёўку** ў цэнтры. Пасля рамонту. Т.: (029) 162 46 12

### АРШАНСКАЯ БІТВА

**Працягваецца падрыхтоўка да фэсту** беларускай аўтарскай песні і паэзіі «Аршанская Бітва». Запрашаем беларускіх выканаўцаў да ўдзелу ў народным свяце. Для інфармацыі: vorsafest.livejournal.com. Сувязь: vorsha2009@gmail.com

### ПРАЦА

**Якасна выканаю пісьмовыя працы** па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Якасны набор, рэдагаванне тэкстаў на беларускай мове. Звяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24 (Юрась)

**Шукаю сталую працу рэдактара** альбо стыль-рэдактара. Стаж працы — шэсць гадоў. Т.: 286–45–73, (044)704–82–71. Эдвард

### ПРАПАНУЕМ

**Кнігі, аўдыё,** значкі (камплект гарады Беларусі), настольныя медалі (Скарына, Купала, Колас), афармленне граматы Роду, нумізматыка (Рагвалод і Рагнеда, нікель), філатэлія (маркі з гістарычнай сімволікай), дашлем спіс прапаноў. Звяртайцеся: alesknigi@mail.ru, (029) 753–91–96

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад** 6005. **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
**Нумар падпісаны ў друк** 23.00 09.06.2009.
**Замова** № 3097.
**Рэдакцыйны адрас**: Ракасоўскага, 102–71.
Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614